Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Замена адрэсу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капярэй пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капярэй паспрэд тэксту 1 р. — к. За радок капярэй перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. дарожай. Зьвы тэрміну бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 к. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрадмётныя і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб. зноскі

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 236 (2725) Аўторак, 15-га кастрычніка 1929 г.

Аб адтэрмінаваньні скліканьня II-й Сэсіі ЦВК БССР.

II-ая СЭСІЯ ЦВК БССР IX-га СКЛІКАНЬНЯ, ЯКАЯ БЫЛА НАЗНАЧАНА НА 25 КАСТРЫЧНІКА, пераносіцца на 13 лістапада гэтага году.

Парадак дню наступны:

1. КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ НА 1929-30 ГОД.
2. ДЗЯРЖАЎНЫ БЮДЖЭТ 1929-30 ГОДУ.
   А) ДАКЛАД СНК БССР;
   Б) САДАКЛАД БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР;
   В) ВЫКАНАНЬНЕ БЮДЖЭТУ ЗА 1927-28 ГОД.
3. АБ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.
4. АБ ЗАЦЬВЕРДЖАНЬНІ ПАЛАЖЭНЬНЯЎ АБ САВЕТАХ І ВЫКАНКОМАХ БССР.
5. АБ ЧЫСТЦЫ САВЕЦКАГА АПАРАТУ.
6. ІНФАРМАЦЫЯ АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ ВІЦЕБСКАЙ АКРУГІ Ў ВОПЫТНА-ПАКАЗАЛЬНУЮ.
7. ІНФАРМАЦЫЯ АБ УСЕБЕЛАРУСКАЙ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ.
8. АБ УТВАРЭНЬНІ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ЗЕМЛЯРОБСТВА САЮЗУ ССР.
9. ЗАЦЬВЕРДЖАНЬНЕ ВАЖНЕЙШЫХ ПАСТАНОЎ, ПРЫНЯТЫХ У ПЭРЫЯД ПАМІЖ СЭСІЯМІ ЦВК.

Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

14 кастрычніка 1929 г. Гор. Менск.

АБ АДТЭРМІНАВАНЬНІ СКЛІКАНЬНЯ ПЛЕНУМУ БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР

ПЛЕНУМ БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР, ЯКІ БЫЎ СКЛІКАН НА 18 КАСТРЫЧНІКА, ПЕРАНОСІЦЦА НА 1-ае ЛІСТАПАДА Г. Г.

Сакратар Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР А. БРУШКОЎ.

ЦЫРКУЛЯРНА.

АБ ПАЛЕПШАНЬНІ УМОЎ ПРАЦЫ ОРГАНАЎ ЗАПІСАЎ АКТАЎ ГРАМАДЗЯНСКАГА СТАНУ

УСІМ АКРУГОВЫМ ВЫКАНАЎЧЫМ КАМІТЭТАМ.

Ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва і абвостранай клясавай барацьбы, у мэтах укараненьня і замацаваньня сярод працоўных новага быту, ад савецкіх органаў і грамадзкіх арганізацый настойліва вымагаецца ўзмацненьне рэальных мерапрыемстваў на антырэлігійным фронце, накіраваных на зжываньне сярод адсталых слаёў насельніцтва рэлігійных традыцый і забабонаў і зьвязанай з гэтым абраднасьці.

Правядзеньню гэтых мерапрыемстваў у жыцьцё павінны служыць таксама органы запісу актаў грамадзянскага стану. У справе ўтварэньня новага быту органы ЗАГС'у павінны мець вельмі актыўнае значэньне, бо яны сваю штодзённую працу вядуць сярод шырокіх мас насельніцтва і непасрэдна на тых вучастках быту, дзе асабліва неабходна барацьба з рэлігійнымі забабонамі і абрадамі культу.

Між тым гэтыя органы ў сваёй пераважнай большасьці яшчэ выконваюць толькі адзін тэхнічны бок сваёй працы на той прычыне, што ўмовы дзейнасьці іх не даюць магчымасьці служыць паказаным грамадзка-палітычным задачам.

У адпаведнасьці з гэтым, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР зьвяртае асабліваю ўвагу акруговых выканаўчых камітэтаў на гэтую галіну работы і прапануе:

1. Зьвярнуць належную ўвагу на работу органаў запісу актаў грамадзянскага стану, зьвязаўшы работу ЗАГС'аў з адміністрацыйна-прававымі і культурна-бытавымі сэкцыямі саветаў і выканаўчых камітэтаў, а таксама і з грамадзкімі арганізацыямі (аддаелы работніц, ячэйкі бязбожнікаў, органы па ахове мацярынства і младзенства, дзіцячыя кансультацыі, прафэсіянальныя саюзы, касы сацыяльнага страхаваньня і г. д.).

2. Пераглядзець асабовы склад органаў запісу актаў грамадзянскага стану, скарыстоўваючы для ўкамплектаваньня яго падрыхтаваных грамадзка-палітычных работнікаў, а ў сельскіх мясцовасьцях таксама работнікаў, якія вядуць культурна-асьветную работу (настаўнікі, заг. хаты-чытальні і г. д.); прыняць рашучыя захады, якія забясьпечылі-б шырокае прыцягненьне жанчын к работе ў органах запісу актаў грамадзянскага стану на аднаковых пасадах загадчыкаў ЗАГС'у, дзе апошнія паложаны па штату.

3. Арганізаваць пры буйных органах запісу актаў грамадзянскага стану дармовыя кансультацыі з мэтай аказаньня юрыдычнай дапамогі і азнаямленьня працоўных з пытаньнямі шлюбнага, сямейнага і апекунскага права. Практыкаваць пастаноўку дакладаў на прадпрыемствах, па ўстановах і на сялянскіх сходах па азнаямленьні шырокіх колаў працоўных з савецкімі законамі аб шлюбе, сам'і і апецы.

4. Выдзеліць у гарадох для органаў запісу актаў грамадзянскага стану ўпаўне адпавядаючыя, па магчымасьці, пасобныя памяшканьні, а ў сельскіх мясцовасьцях скарыстоўваць, па магчымасьці, для работы па запісу актаў грамадзянскага стану памяшканьні для вядзеньня культурнай работы (хаты-чытальні, чырвоныя куткі, клюбы) у адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі.

5. Утварыць у органах запісу актаў грамадзянскага стану такую знадворную абстаноўку, якая адпавядала-б дзяржаўнай і грамадзкай важнасьці актаў, якія ў гэтых органах адбываюцца.

6. Узмацніць нагляд і інструктаваньне за работай нізавых ячэек ЗАГС'у, асабліва па сельсаветах.

7. З мэтай забясьпечаньня нармальнай работы органаў актаў грамадзянскага стану неабходна прадугледзець павялічэньне водпуску сродкаў на ўтрыманьне паказаных органаў па мясцовых бюджэтах з тым, каб за кошт гэтага павялічэньня былі палепшаны як пастаноўка работы ў органах ЗАГС'у, гэтак і матар'яльнае становішча іх работнікаў.

В. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.

5 кастрычніка 1929 г. г. Менск.

Неабходны рашучы пералом

З пастановы ЦК УсеКП(б) аб масавай партасьвеце на вёсцы.

МАСКВА. ЦК зварочвае ўвагу партарганізацый на неабходнасьць рашучага пералому ў пастаноўцы масавай партасьветы на вёсцы і правядзеньні шэрагу мерапрыемстваў.

Для больш поўнага ахопу партыйнай вучобай кандыдатаў партыі і беспартыйных батракоў, вясковай беднаты і калгасьнікаў шырока практыкаваць заснаваньне, поруч з партыйнымі школамі, курсаў-зьездаў, і асабліва, батрацкіх курсаў, праводзячы іх ня толькі па лініі партарганізацый, але і па лініі прафсаюзных, клапэрацыйных, савецкіх і іншых арганізацый.

Разгарнуць для партыйнага і беспартыйнага актыву сетку гурткоў бягучай палітыкі, прадметных гурткоў і, асабліва, сацыяльных гурткоў па вывучэньні пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі, мясцовых гаспадарчых плянаў, задач і практыкі.

Забясьпечыць разгортваньне ў калгасах, савгасах і пры машынна-трактарных станцыях сеткі партыйных школ і гурткоў, у першую чаргу ўмацаваць іх падрыхтаванымі прапагандыстамі.

Для заснаваньня большай сувязі працы партыйных школ і гурткоў з практычнымі задачамі партыйнай працы па вёсцы (хлебазагатоўкі і г. д.) даручыць АПАД ЦК перабудаваць вучэбныя пляны партыйных школ і гурткоў з тым, каб пакінуць ня менш трэцяй часткі вучэбных плянаў для прапрацоўкі бягучых гаспадарчых і палітычных пытаньняў. Уключыць вывучэньне аграграматы ў праграму ўсёй сеткі партасьветы, асабліва ў праграмы вячэрніх савпартшкол.

Органам народнае асьветы пры ўдзеле клапэрацыйных і прафэсіянальных арганізацый уцягнуць пагалоўна ўсіх няпісьменных камуністаў і камсамольцаў у сетку ўстаноў па зьнішчэньні няпісьменнасьці, ліквідаваўшы іх няпісьменнасьць на працягу бліжэйшага году.

АПАД ЦК УсеКП(б), ЦК нацкампартый, абкомам і крайкомам УсеКП(б) забясьпечыць выданьне адпаведнай літаратуры, у прыватнасьці, па пытаньнях пяцігадовага пляну і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў райённым разрэзе і агульнай райённай літаратуры па пытаньнях аграграматы.

Прыцягнуць да прапагандысцкай працы ў вясковых арганізацыях асоб, скончыўшых камуністычныя ВНУ і накіраваных, згодна пастаноў 15-й партканфэрэнцыі, на партыйную працу ў вёску.

Для забясьпечаньня сыстэматычнага кіраўніцтва к боку парткомаў, склікаць ня менш 2-х разоў на год раённыя ці куставыя нарады вясковых прапагандыстаў.

Рашучы бой кулацкаму тэрору.

Да расстрэлу за параненьне старшыні с-с.

БРАНСК, 14-X. Буйны кулак, які мае клын і воўначоску, Кузьма Міхаілаў за параненьне старшыні сельсавету Дубовага выязной сэсіяй акруговага суду ў вёсцы Рабцы, Трубчаўскага раёну, прыгаворан да расстрэлу.

Яшчэ адзін пераможны крок.

У адказ на кулацка-нэпманскае супраціўленьне, на спробы імпэрыялістаў справакаваць СССР на вайну беднякі і серадняк шэрагу вёсак і раёнаў чырвонымі абозамі здаюць дзяржаве хлеб.

Тэлеграма чырвонаабозьнікаў ЦК КП(б)Б.

Мы, грамадзяне вёскі Фільяны, Хатлянскага с-с., сёньня прывезьлі чырвоным абозам свае лішні хлеба дзяржаве, улічваючы важнасьць і напружанасьць сацыялістычнага будаўніцтва ў галіне цяжкай індустрыі і калектывізацыі нашае сельскае гаспадаркі, дабрахвотна здаем чатырыста пудоў хлеба. Просім урад аб павялічэньні завозу нам штучнага ўгнаеньня, забясьпячэньня нас сельска-гаспадарскімі машынамі, прамысловымі таварамі, павялічэньня абслугоўваньня нас культурнымі сіламі, аграномамі, прысылкі літаратуры па сельскай гаспадарцы.

Усе сілы мы накіруем на выкананьне 5-цігадовага пляну і рашуча павядзем барацьбу з кулацтвам. Адабраем палітыку нашай партыі і ўраду.

Няхай жыве Камуністычная партыя, кіраўнік працоўных мас! Няхай жыве савецкая ўлада! Няхай жыве рабоча-сялянская Чырвоная армія, якая абаронае савецкія граніцы ад нападу буржуазіі!

Старшыня Лошанскага с-с. ЛІТВІНЮК.
Сакратар Лошанскай ячэйкі КП(б)Б РАДЗЮК.

* * *

Мы, грамадзяне вёскі Бабавое, Лошанскага с.-с. прывозім чырвоным абозам паўтары тоны хлеба. Мы яшчэ больш згуртуем свае сілы вакол камуністычнае партыі і будзем дапамагаць адбудоўваць народную гаспадарку. Ніводнага хунта опэкулянту! Няхай жыве ЦК КП(б)Б, кіраўнік працоўных мас! Няхай жыве савецкая ўлада!

Члены камісіі.

Здалі 12 тысяч пудоў хлеба

(*Па тэлеграфу ад нашага карэспандэнта*).

Магілеў, 13-X. Сёньня вуліцы Магілева перапоўнены чырвонымі абозамі. Абоз з Заходзкага с-с., Лупалаўскага раёну, здаў 2000 пудоў хлеба; тры абозы Цішэўскага с-с. прывезьлі 4000 пудоў, з Пашкоўскага с-с.—3000 пуд., з Градзенскага—3000 пуд. разам здадзена каля 12 тысяч пудоў хлеба. Адбыліся два мітынгі. Чырвонаабозьнікі казалі:

— Ніводнага фунта прыватніку:

— Усе лішкі—дзяржаве!

ЗДАЛІ БОЛЬШ ДЗЕСЯЦІ ТЫСЯЧ ПУДОЎ.

Учора—у „Дзень калектывізацыі і ўраджаю"—чырвоныя абозы Сьмілавіцкага, Самахвалаўскага, Лагойскага і Заслаўскага раёнаў здалі дзяржаве больш дзесяці тысяч пудоў хлеба. На Пляцу Волі адбыўся мітынг, на якім чырвонаабозьнікі заявілі:—у адказ на наступ кулака ў вёсцы, нэпмана ў горадзе і капіталістаў па-за межамі мы яшчэ арганізуем дзесяткі чырвоных абозаў!

Прахожыя стараліцца і зьдзіўлена глядзяць на сёлян, на іх коняй, на мяшкі, што ляжаць на калёсах.

Хлеб бяжыць,—
сялянскі,
мазолісты,
чырвоны—
адзнака саюзу рабочых і сялян.

— А ня сілаю яго біруць?

— Не пры дапамозе міліцыі?

— Не па мэтаду дваццатага году!

І хітрая ўсьмешка абываталя суправаджае чырвоны абоз. Яму, абываталю, і не абываталю, а нэпману, актыўнаму ворагу савецкае ўлады, хочацца бачыць нашу сапраўднасьць праз акуляры варожасьці паміж рабочай клясай і бядняцка-серадняцкім сялянствам.

Удубальт яму кулак вёскі шэпча суседзям:

— Рэквізіцыя...

— Харчпадатак...

— Рабунак сялянскіх клюцяў...

І ў адказ кулаку вёскі і буржуа гораду беднякі і сераднякі чатырох раёнаў—Сьмілавіцкага, Самахвалавіцкага, Лагойскага і Заслаўскага—каля 700 падвод—вязуць у Менск больш дзесяці тысяч пудоў хлеба.

Грукат сялянскіх фурманак заглушае звон трамваю і гул аўтобусаў. Чырвоныя абозы без канца і краю—ад Пляцу Волі і кудысьці за Ляхаўку—прывезьлі рабочаму гораду харчаваньне.

На мітынгу, прысьвечанаму здачы хлеба, выступалі прадстаўнікі АК КП(б)Б, акрвыканкому, праўленьня селгаскапэрацыі, чырвонаштандартнага заводу „Бальшавік", Менскага Крэдытсаюзу.

Адказвалі на прывітаньні актыўныя ўдзельнікі чырвоных абозаў. Селянін Каранеўскі з Нова-Дворскага с-с сказаў:

— Тры тысячы пудоў прывёз наш сельсавет і гэта лепшы ўдар па кулацкай частцы вёскі. Забясьпечым гораду хлебам, а рабочым нас машынамі.

Селянін Літоўчанка ў сваёй прамове дадаў:

— Няпраўда, што нас прымушаюць здаваць хлеб. Мы, беднякі і сераднякі, здаем хлеб добраахвотным парадкам. Калі мы сёньня прывезьлі 10 тысяч пудоў, гэта ня знача, што мы яшчэ не арганізуем здачу лішкаў хлеба. Мы ўвесь хлеб здадзім клапэрацыі, дзяржаве, рабочаму гораду. Ні фунта прыватніку, ні кілёграма нэпману. Замест сьвята Пакрова мы стварылі „Дзень калектывізацыі і ўраджаю". Я заклікаю ўсіх уступіць у колгасы, бо толькі пры дапамозе іх можна перабудаваць сельскую гаспадарку.

Рабочы Бальчук словамі ўсіх пралетарыяў Менску аказаў сялянам:

— Селянін—гораду, рабочы—вёсцы. Вы нам хлеб, мы вам машыны. Наш саюз моцны, і ніхто яго не паруша. Рабочыя ўзьнімаюць вытворчасьць, паляпшаюць якасьць прадуктаў, уступаюць у сацыялістычнае спаборніцтва, а вы, беднякі і сераднякі, павінны палепшаць сваю гаспадарку—арганізоўваць калгасы, бо толькі пры дапамозе іх можна выйсьці з беднасьці і няшчасьця.

N.

КАТАСТРАФІЧНАЕ СТАНОВІШЧА НАНКІНСКАГА УРАДУ.

Чан-Кай-Шы абвінавачваецца ў здрадніцтве.

ЗАКЛІК ДА ЕН-СІ-ШАНА І ФЫН-ЮЙ-СЯНА СТАЦЬ НА ЧАЛЕ ПАЎСТАНЦКІХ ВОЙСК.

ШАНХАЙ, 14-X. Сёньня стала вядомым вымест абежнай тэлеграмы, пасланай генэраламі Га-Мін-Цьюня (народная армія Фынь-Юй Сяна).

У тэлеграме зазначаецца, што краіна дайшла да пагібелі дзякуючы промахам Чан-Кай-Шы. Тэлеграма кідае Чан-Кай-Шы абвінавачваньне ў дыктатуры і ў пераводзе дзяржавы ў «прыватную ўласнасьць Чан-Кай-Шы». Супроць нанкінскага ўраду высоўваецца абвінавачваньне ў хабарніцтве пры назначэньні новых чыноўнікаў з ліку сваякоў і прыхільнікаў Чан-Кай-Шы, у выдаткаваньні вялікіх сродкаў на невядомыя мэты ў той час, як на паўночным захадзе Кітаю памірае ад голаду 20 мілёнаў чалавек, здрадніцтва Чан-Кай-Шы ў адносінах да «многіх барацьбітоў рэвалюцыі», поўнай нездольнасьці ўпарадкаваць канфлікт з СССР. Аўтары тэлеграмы заклікаюць Ен-Сі-Шана і Фынь-Юй-Сяна «ўзяць на сябе адказнасьць за выратаваньне армій» і заўважаюць, што яны вядуць за сабою 400 тысяч салдат супроць Нанкіну з мэтаю «забіць здрадніка». Цікава, што тэлеграма паслана в рэзыдэнцыі Ен-Сі-Шана.

Змова генэралаў супроць Нанкіну.

ШАНХАЙ, 14-X. Нанкінскі ўрад пры дапамозе агенцтва Гомінь агаласіў заяву, якая падцьвярджае факты, устоеныя да гэтага часу. У заяве падцьвярджаецца, што выкрыта шырокая змова супроць ураду з удзелам многіх вайсковых дзеячоў поўдню і поўначы. Змова прадугледжвае захоп Нанкіну, Ханькоў і Кантону, прычым Фынь-Юй-Сян павінен быў рушыцца супроць Нанкіну, а Чан-Фа-Гуй супроць Ханькоў, гуансійцы-ж павінны былі захапіць Кантон. Урад заяўляе, што ён ужыў шэраг захадаў, і прызначыў выключную сур'ёзнасьць сучаснага крызісу, спадзяецца на посьпех у справе ліквідацыі змовы.

Распачаліся ваенныя апэрацыі ў Шандуні.

ШАНХАЙ, 13-X. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе, што 11-га кастрычніка ў правінцыі Шандунь распачаліся ваенныя апэрацыі між генэраламі Сунь-Цянь-Пінам, які адлучыўся ад нанкінскага ўраду, і пэйпінскім генэралам Фан-Сі-Чы. У сувязі з гэтым у правінцыі стварылася вельмі напружанае становішча.

Далей паведамляецца, што войска, якое дзейнічае пад камандаю прыхільніка Фынь-Юй-Сяна, узарвала чыгуначную каляіну на Луньхайскай чыгунцы, у сувязі з чым выслана войска з Нанкіну. Да Ен-Сі-Шана зьвярнуліся, з аднаго боку, нанкінскія лідэры, а з другога— генэралы Го-Мін-Цьюня (так званай народнай арміі, заснаванай Фынь-Юй-Сянам) з заклікам мабілізаваць войска.

* * *

ШАНХАЙ, 12-X. Некалькі дзён назад атрады Гамінь-Дзюня („народнай арміі" Фынь-Юй-Сяна) выступілі па Луньхайскай чыгунцы ва ўсходнім напрамку з мэтаю заняць горад Хунань. Думаюць, што Тан-Шэн-Чы знаходзіцца ў саюзе з Гамінь-Дзюнем, аднак, в прычыны яго набыту ў Нанкіне, прыхільнікі Тан-Шэн-Чы ня могуць адкрыта заявіць аб сваёй пазіцыі.

Посьпехі рэвалюцыйных атрадаў Чу-Дэ.

ШАНХАЙ, 12-X. Водлуг паведамленьня агенцтва Тачун, рэвалюцыйныя атрады Чу-Дэ занялі горад Хехуа Фуцзянскай правінцыі. Агенцтва зазначае, што атрады Чу-Дэ ў апошні час нанесьлі сур'ёзныя паражэньні ўрадаваму войску.

Канцэнтрацыя сіл наваколо Фынь-Юй-Сяна.

ШАНХАЙ, 14-X. Агенцтва Тачун паведамляе, што Ен-Сі-Шан і Фынь-Юй-Сян ужо адказалі на дэкларацыю генэралаў Гаміньцзюню, якая заклікала іх стаць на чале паўночнага войска, якое імагаецца в Нанкіным. Прадаўжаецца далейшая канцэнтрацыя войска генэралаў, якія спачуваюць Фынь-Юй-Сяну. З друга боку Нанкін выдае загады аб спыненьні чыгуначных зносін у райёнах пасоўваньня войска ворага і пасылае тэлеграму Ену з заклікам прыдушыць паўстаньне на паўночным захадзе Кітаю і аб рэпрэсіях у адносінах Фынь-Юй-Сяна.

Правакацыя Нанкіну.

ШАНХАЙ, 14-X. У заяве, агалошанай нанкінскім урадам між іншым зазначана аб сувязі Фынь-Юй-Сяна з СССР і аб заціжцы перамоў наконт УК чыгункі з боку СССР, нібыта, в мэтаю даць дапамогу Фынь-Юй-Сяну.

* * *

ТОКІЁ, 14-X. Савецкія грамадзяне, зьяўленыя ў Сумбэйскім лагеры, абвяшчаюць 3-хдзённую галадоўку ў знак пратэсту супроць нячуваных умоў зьяўленьня.

ПРЫХІЛЬНАСЬЦЬ НА БАКУ СССР

Працоўныя Кітаю патрабуюць перарабіць бажніцы ў школы.

ПЭЙПІН, 11-X. У Пэйпіне ўгодкі кітайскай рэвалюцыі былі адсьвяткаваны толькі мітынгам, на якім ухвалена рэзалюцыя з патрабаваньнем, каб урад выдаў загад перарабіць бажніцы ў школы, і з заяваю, што калі мясцовая ўлада ня выканае гэтае пастановы ў тыднёвы тэрмін, дык памяшканьні бажніц будуць канфіскаваны. Улада, баючыся, што дэманстрацыі будуць выкарыстаны камуністамі, адмяніла парад, які меркавалася наладзіць пасьля паўдня. Мітынгі ў Цяньцзіне і Пэйпіне характарызаваліся адсутнасьцю антысавецкіх настроеў, не зважаючы на ўсе патугі ўлады і Гаміндану выкарыстаць гэтыя мітынгі супроць СССР.

ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА У АЎГАНІСТАНЕ

ТЭРМЭЗ, 12-X. Тут атрыманы весткі, што адступіўшыя ў часе захопу Кабулу Шахвалі-ханам кугістанцы, ізноў арганізавалі і павялі наступ на паўдзённа-ўсходні порт Кабулу Бала-Гісар. Наступ гэты пасьля бою быў адбіты. Ноччу, перад 12 кастрычніка Бачэ-Сакао прарваўся з Арка і накіраваўся ў Кугістан. У горадзе ня спыняюцца рабункі.

Арк захоплен войскамі Надыр-хана.

ТЭРМЭЗ, 12-X. Водлуг атрыманых вестак, Арк захоплен войскам Надыр-хаца. У горадзе паступова наладжваецца парадак.

* * *

ТЭРМЭЗ, 12-X. Водлуг атрыманых тут вестак, Сэйд-Гусэйн, які знаходзіцца ў Мазар-І-Шарыфе, разам з кугістанцамі пакінуў Мазар-І-Шарыф і сьпяшаецца на дапамогу Бачэ-Сакао. У яго загадзе ёсьць да 3 тысяч чалавек, з якіх дывізія з кугістанцаў зьяўляецца вельмі надзейнай.

„Дэйлі Мэйль" аб захопе Кабулу.

ЛЁНДАН, 12-X. „Дэйлі Мэйль" агаласіла вялікае паведамленьне аб паходзе, які прывёў да захопу Кабулу Надыр-ханам. У паведамленьні шырока апісваюцца апэрацыі 3-х армій пад камандаю самога Надыр-хана і яго братоў Волі і Махмуда. Газэта зазначае, што гэтае паведамленьне было атрымана ў Пэшавары з нарачным пасланцом з стаўкі Надыр-хана. Нарэшце, зазначана, што далейшыя апэрацыі Надыр-хана нельга прадбачыць.

Патрэбна адзінства.

КОЎНЯ, 10-X. У сувязі з 10-мі ўгодкамі захопу Вільні быўшы прэм'ер Вальдэмарас выступіў з прамоваю на шматлюдным сходзе моладзі у студэнцкай вопратцы. Вальдэмарас зазначаў на неабходнасьць адзінства для далейшай барацьбы за Вільню і адзначыў, што ў сучасны момант гэтае адзінства зьяўляецца няпоўным.

Перамога Алёхіна.

БЭРЛІН, 13-X. 12-ая партыя шахматнага турніру на першынства між Алёхіным і Багалюбавым скончылася перамогаю Алёхіна пасьля 56-га ходу. Становішча турніру: у Алёхіна 6 выйграных партый, у Багалюбава —2,4.

ЦКК РСІ аб будаўніцтве.

Адкрыты ліст

усім будаўнічым і будуючым арганізацыям, Белдзяржбуду, Гандльбуду, Трэстам, Наркаматам, ВСНГ, НК Гандлю, АВК, Жыльлёвай каапэрацыі, транспартным, вайсковым органам, Белдзяржгандлю, Саюзу Будаўнікоў, прафсаюзам, рэдакцыям газэт, рабкорам, насьценкорам, сэкцыям і камісіям РСІ Гар. і Райсаветаў.

Практыка абсьледваньня капітальнага будаўніцтва і падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону 1928-29 г. паказвае, што будаўніцтва дрэнна вядзецца і падаражаецца ў значнай ступені па прычыне несвоечасовай і нездавальняючай падрыхтоўкі да будаўніцтва. Пастановы НК РСІ і ўрадавых органаў сьведчаць аб несвоечасовым пачатку праэктаваньня, падрыхтоўцы будаўнічых матар'ялаў, нескарыстаньні танных спосабаў дастаўкі матар'ялаў (санная дарога), непрыняцьці мер для палепшаньня якасьці матар'ялаў, адсутнасьці каляндарных плянаў пачатку і вядзеньня будаўніцтва, несвоечасовасьці перадачы заказаў на абсталяваньне, адсутнасьці ўвязкі паміж тэрмінам заказаў, атрыманьнем абсталяваньня і тэрмінам вядзеньня будаўніцтва, расьцяжкі ў будаўніцтве (2—3 гады) несвоечасовасьці падрыхтоўкі рабочай і тэхнічнай сілы, адсутнасьці належнага тэхнічнага і адміністрацыйнага кіраваньня будаўніцтвам, наяўнасьці вялікай разгонкі ў аплаце паасобных кваліфікацыйных рабочых, адсутнасьці належнай правільнай і навуковай арганізацыі працы і г. д.

Гэтыя недахопы паказваюць, што з боку органаў, якія маюць у той ці іншай ступені адносіны да будаўніцтва, праяўлена ў многіх выпадках нядбайнасьць. Слаба разгорнута была грамадзкая праца вакол пытаньняў падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону, партыйныя калектывы і ячэйкі, насьценныя газэты, прафсаюзы і інш. як у працэсе падрыхтоўкі, так і правядзеньні будаўніцтва слаба займаліся гэтым пытаньнем. Такім чынам, замест вялікага прыцягненьня мае і разгортваньня самакрытыкі, такі важны фронт застаўся нават без належнай увагі і без абстрэлу слабых вучасткаў з боку ўсе грамадзкасьці. Ня створана аднаведная нецярпімасьць да недахопаў у будаўніцтве з боку шырокіх колаў рабочых.

Для зьнішчэньня недахопаў у падыходзячым 1929-30 будаўнічым годзе і гэтым забясьпечыць больш поўную эфэктыўнасьць будаўніцтва і поўнае выкананьне асноўнай дырэктывы партыі аб большым палепшаньні якасьці паказальнікаў, неабходна паставіць, як бясспрэчную задачу:

Забясьпечыць заканчэньне праэктаваньня аб'ектаў пляну 1929-30 г. не пазьней студзеня на падставе пастановы Эканом Нарады БССР і забясьпечыць пачатак будаўніцтва рабочымі чярцяжамі.

Своечасова і правільна ўстанавіць патрэбы будаўнічых матар'ялы для будуемых аб'ектаў з тым, каб дагаворы з органамі-пастаўшчыкамі былі заключаны не пазьней лістапада.

Падаць заяўкі бу аўнічымі органамі на небходныя зямельныя вучасткі для будаўніцтва да сьнежня і абавязковага адводу камгасамі не пазьней 1 студзеня.

Будаўнічым органам і органам НК Працы вызвіць патрэбнасьць у рабочай сіле і не пазьней 1 лютага 1930 г. скласьці план патрэбнай для БССР рабочай сілы і намеціць мерапрыемствы па своечасоваму снабжэньню ім будаўніцтва.

Будаўнічым і будуючым органам да 1-XI-29 г. скласьці каляндарныя апэрацыйныя пляны для вядзеньня будаўніцтва, у якіх павінны быць яскрава вызначаны чоткія каляндарныя тэрміны па заказу і атрыманьню матар'ялаў, абсталяваньня, прыцягненьню рабочай сілы, пачатку і вядзеньня будаўнічых работ і г. д. Пляны павінны быць кіруючым і кантрольным фактарам у працы будаўнічых органаў. Пляны павінны быць пабудаваны з такім разьлікам, каб будаўніцтва прадпрыемстваў вялося ў адзін сэзон, мантаж на працягу зімовага і другога летняга пэрыяду і ўвод прадпрыемстваў у вытворчы працэс не пазьней наступнай за будаўнічым годам, зімы.

Арганізацыям, вытвараючым будаўнічыя матар'ялы (Лесбел, Стромтрэст і г. д.) прыняць усе меры да палепшаньня якасьці будаўнічых матар'ялаў на падставе маючыхся дырэктыў у гэтай галіне.

Своечасова правесьці абсьледваньне грунтаў для будаўніцтваў з тым, каб ні мелі месца недахопы ў сувязі з дрэнным выбарам месц пабудовы.

Намеціць шэраг мерапрыемстваў па забясьпечаньню максымальнай рацыяналізацыі і мэханізацыі будаўніцтва і па зьніжэньню кошту з тым, каб у пляне кожнага аб'екту былі яскрава вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы ў гэтай галіне і шляхі для іх правядзеньня.

У кожным гаспадарчым органе, пераводзячым будаўніцтва, абавязкова павінен быць плян гэтай падрыхтоўкі і пытаньні падрыхтоўкі павінны быць ускладзены на пэўную адказную асобу.

Будаўнічаму камітэту пры Эканомнарадзе забясьпечыць своечасовы пачатак работы на вопытнаму будаўніцтву і навукова-дасьледчай працы ў галіне будаўніцтва, для гэтай мэты неадкладны шэраг мерапрыемстваў.

Машына-будаўнічыя органы павінны неадкладна прагледзець свае абавязацельствы па пабудове абсталяваньня для будаўніцтва і прыняць усе меры, каб усе тэрміны ўстаноўленыя былі поўнасьцю вытрыманы.

Паставіць перад партыйнымі калектывамі і ячэйкамі задачу абавязковага разгортваньня працы вакол пытаньняў падрыхтоўкі, завастрэньня ўвагі ўсіх грамадзкіх органаў і прыцягненьня да гэтай справы ўсёй рабочай масы. Практыкаваць заслухоўваньне дакладаў кіраўнікоў гаспадарчага органу аб ходзе падрыхтоўкі.

Газэтам цэнтральным, акруговым, заводскім друкаваным і насьценным, прыцягненьне ўсіх рабкораў і насьценкораў наладзіць сыстэматычнае асьвятленьне пытаньняў падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону.

Сэкцыям РСІ пры гарсаветах, упаўнаважаным АКК-РСІ, сэкцыям і камісіям РСІ пры райвыканкомах, лёгкай кавалерыі актыўна прыняць удзел у працы па мабілізацыі грамадзкай думкі вакол пытаньня падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону.

Прыведзенымі мокантамі ня вычэрпваюцца тыя задачы, якія стаяць як перад непасрэдна апэрацыйнымі органамі—будаўнічымі, так рэгулюючымі, партыйнымі і грамадзкімі органамі. Задачы па палепшаньню, патаньненьню і больш эфэктыўнаму будаўніцтву зьяўляюцца здзяйсьненьнем асноўнымі 5-гадовага пляну на генэральнай рэканструкцыі нашай сацыялістычнай гаспадаркі.

Выкананьне гэтай задачы магчыма пры ўмовах шырокага ўдзелу ўсіх працоўных у галіне лепшага будаўніцтва і гэтым выканаць асноўную задачу партыі перагнаць у сваім разьвіцьці перадавыя капіталістычныя дзяржавы, а таксама пры ўмовах, калі ўсе арганізацыі неадкладна прыступяць да жорсткага і паступовага поўнага правядзеньня маючыхся ў гэтай галіне дырэктыў партыі і ўраду. Паступовае правядзеньне і выкананьне гэтых дырэктыў забясьпечыць правільную падрыхтоўку да будаўніцтва.

ЦКК РСІ лічыць, што практычнай задачай вытворчых і эканомкамісій і нарад, сэкцый і камісій РСІ гар. і райсаветаў, атрадаў лёгкай кавалерыі і ўсёй рабочай грамадзкасьці павінна быць арганізацыя на сваіх прадпрыемствах і ўстановах сыстэматычнай праверкі выкананьня пастаноў у гэтай галіне і паказаньняў, адзначаных гэтым лістом, своечасова сыгналізаваць аб недахопах і гэтым забясьпечыць практычнае правядзеньне гэтых дырэктыў.

АКК РСІ прыступіць у сьнежні месяцы да праверкі мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону.

Старшыня ЦКК—Наркам РСІ БССР Калніш.

Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1929-30 г.

Кантрольныя лічбы бягучага году—баявое дзеяньне, наступ пралетарыяту і перамога яго клясавай лініі.

Больш актыўнасьці, праверкі і крытыкі з боку працоўных—гэта пэўны шлях выкананьня пяцігодкі, шлях перамогі сацыялізму над капіталізмам.

(З дакладу тав. М. Каркліна на фрунзаўскай райённай канфэрэнцыі рабочых 12-X-1929 г.).

ПЕРАМОЖАМ ЦЯЖКАСЬЦІ, ВЫКАНАЕМ ПЯЦІГОДКУ.

Ня гледзячы на шэраг цяжкасьцяў у начатку гаспадарчага году—наш першы год пяцігодкі ажыцьцёўлен у асноўным поўнасьцю.

Нашы ўстаноўкі, наша лінія на сацыялістычную індустрыялізацыю краіны засталася непарушнай.

Наша стаўка на шырокае калгаснае будаўніцтва падхоплена бурным уздымам шырокіх мас беднаты і серадняцтва вёскі.

Нашы дасягненьні даюць права сказаць, што правільна рабіла партыя, патрабуючы напружаных тэмпаў у рабоце пяцігодкі.

Нашы дасягненьні і посьпехі даюць нам магчымасьць ня толькі ў саюзнай пяцігодцы, але і ў пяцігодцы Беларусі выставіць на другі год пяцігодкі шэраг зусім новых тэмпаў росту паказальнікаў і патрабаваньняў, высоўваюць зусім новыя дадатковыя патрабаваньні перад навукай, культурным будаўніцтвам, нашымі спэцыялістамі і тэхнікамі ў справе дапасаваньня сваіх ведаў.

Нашы дасягненьні са ўсёй выразнасьцю даюць нам магчымасьць на справе бачыць правільнасьць слова намага вялікага настаўніка Леніна аб тым, што:

«Зьліцца з сялянскай масай, а радавым працоўным сялянствам і пачаць рушыць уперад непамерна, бясконца павальней, чымся мы марылі, але за тое так, што сапраўды будзе рушыцца ўся маса з намі. Тады паскораньне гэтага руху ў свой час наступіць такое, аб якім мы зараз і марыць ня можам. А ці гэты час ня прышоў? Ці гэтыя паказальнікі росту, якія мы маем, не гавораць яскрава, як праў быў Ленін і ў гэтым пытаньні?

ШТО СПРЫЯЛА НАШЫМ ПОСЬПЕХАМ:

Непарушная ўпэўненасьць пралетарыяту ў рэальнасьці сацыялістычнага пляну; высокі заслужаны аўтарытэт нашай камуністычнай партыі пры вырашэньні ўсіх задач; захаваньне пралетарскай жалезнай дысцыпліны пры ажыцьцяўленьні **п л я н у** і правядзеньні клясавай лініі ў рабоце; высока ўзьнятая пралетарская крытыка і самакрытыка ад нізу да верху; захаваньне саюзу рабочае клясы з пераважнымі масамі—сялянства, г. зн. беднатой і сераднякамі вёскі; сапраўдная мабілізацыя ўсіх сіл і сродкаў працоўных усёй краіны навакол сацыялістычнага пляну; бязьлітасная барацьба са ўсімі шкоднікамі, контр-рэвалюцыйнымі элемэнтамі і наогул коснасьцю і бюракратызмам нашага савецкага апарату.

І, нарэшце, ужо атрыманыя вынікі нашых капітальных укладаньняў у плянавым соцыялістычным будаўніцтве.

На прамысловасьці—рост валавай прадукцыі (ВСНГБ) намячаў у 36,7 проц., а фактычна будзе 47,3 пр. Рост рабочай клясы быў намечан у 14,8 проц., фактычна рост—21,5 пр. Рост зарплаты (намінальны) намечан быў у 8 проц., фактычны—11,2 пр.

Рост прадукцыйнасьці працы намечан быў у 19,1 проц., фактычны—24,3 пр.

Рост пасеўнай плошчы—2 проц.

Рост ураджайнасьці ўзьнялі (па зернавых) на 11,6 проц. у параўнаньні з 1928 годам, рост калектывізацыі быў намечан на 55 проц., а дасягнута—180 проц. росту, колькасьць калгасаў вырасла з 994 да 1679 на 1-IX—22 г. з ахопам 287 тыс. гектараў плошчы, або 3,2 проц. усёй пасеўнай плошчы.

Апроч гэтага, ва ўсіх асноўных паказальніках сацыялістычны сэктар у народнай гаспадарцы, г. зн. аграмаджаньне, мерапрыемства даюць найвялікшы эфэкт нашых капітальных укладаньняў.

Гэта відаць у савгасах, у калгасах. Індывідуальны сельска-гаспадарчы сэктар у многім адстаў па тэмпу росту ад аграмаджанага сэктару народнае гаспадаркі.

ВЫКАНАЦЬ ПАДВЫШАНЫ ПЛЯН.

Усе гэтыя паказальнікі далі поўную магчымасьць наш плян—плян гэраічных работ узьняць яшчэ вышэй на 1929-30 год, які дзякуючы гэтаму на сваіх колькасных і якасных патрабаваньнях вышай чым у 1928-29 г.

На прамысловасьці (усёй цэнзавай) на гэты год мяркуецца рост па валавай прадукцыі на 60—61 проц.; па прамысловасьці ВСНГБ — 65 проц.; рост рабочых—на 28 проц., або каля 10 тыс. чалавек; рэальная зарплата—на 11 проц. (у тым ліку на 8 пр. яна намінальна расьце); прадукцыйнасьці працы—на 26-27 проц.

У вырабе сродкаў вытворчасьці прадукцыйнасьць працы павінна ўзьняцца на 8,1 проц., а па вырабу сродкаў спажываньня — на 38,2 проц.

Тут асабліва многа павінны зрабіць па другой групе вырабу—якая ўсё яшчэ многа адстае ад агульнага росту рацыяналізацыі вытворчасьці. Зьніжэньне сабекошту павінна быць дасягнута на 10 проц., а зьніжэньне будаўнічага індэксу па прамысловаму будаўніцтву—на 13 проц. і па жыльлёваму будаўніцтву на 10 проц.

Рост капітальнага будаўніцтва даводзіцца да сумы 52 мільёны руб. па пляну; жыльлёвага будаўніцтва—на 13 м., замест 8 млн. 300 тыс. р.

У галіне сельскай гаспадаркі плян патрабуе:

Росту пасеўнай плошчы—на 4 пр., ураджайнасьці ў індывідуальн. сялянск. сэктары—на 20 проц., у савгасах—на 30 проц., у калгасах на 25 проц.

Рост колькасьці калгасаў па ахопу пасеўнай плошчы павінен павялічыцца з 3,2 проц. да 11,6 проц., а ўся ўдзельная вага сацыялістычнага сэктару ў савгасах па пасеўнай плошчы павінна ахапіць каля 13 проц.

Рост каапэраваньня сялянскіх двароў давесьці да 90 проц. (па спажыв. каапэрацыі), а каапэраваньне рабочых (членаў прафсаюзаў) давесьці да 100 проц. Плянавыя загатоўкі аграмаджанага сэктару павінны вырасьці на 31—32 проц., у тым ліку па сельскай гаспадарцы ахоп узьнят з 52 проц. да 65 проц.

Па пытаньнях асьветы намечана ўвесьці абавязковую агульную адукацыю дзяцей з 8-мігадовага ўзросту і ліквідаваць няпісьменнасьць падлеткаў з 12—15 гадовага ўзросту.

Апроч гэтага, пастаўлена задача на 30 проц. ахапіць прадпрыемствы сямігадзінным рабочым днём.

Гэтыя лічбы цесна зьвязаны з глыбокімі фактарамі сацыялістычнай рэканструкцыі як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы. Увядзеньнем новых тэхнічных форм работы, лепшых машын, лепшай арганізацыі працы, больш калектыўнай прадукцыйнасьці працы, больш узаемнай сьвядомай дысцыпліны і г. д.

Нашы электрастанцыі літаральна ня маюць магчымасьці задаволіць усё павялічваючыйся запыт. Мы пашыраем і канчаем пачатыя станцыі (Асінбуд) з узмоцненым тэмпам і пачынам пабудову новых (другая раённая станцыя ў Гомелі і інш.).

Мы наша будаўніцтва так хутка разгортваем, што не хапае ў некаторых мясцох будаўнічых матар'ялаў і рабочых рук, у прыватнасьці зараз беспрацоўе значна больш зьмяншаецца, чым гэтага чакалі.

Мы стаім перад грандыёзнай работай падрыхтоўкі кадраў як спэцыялістаў, так і кваліфікаванай рабочай сілы. Па будаўніцтву намячаецца падрыхтаваць 5.150 чалавек, на што патрабуецца выдаткаў каля 1.200 т. руб., па гандлю прапусьціць праз курсы каля 1.000 рабочых прылаўка і г. д.

Вось агульны тон новага росту сацыялістычнага ладу, які адзіна здольны быў высунуць і зусім рэальна паставіць шэраг зусім новых глыбокіх задач як:

Сацыялістычнае спаборніцтва па ўсіх лініях работы—мабілізацыя мільёнаў людзей і пераход на бесперапынны рабочы тыдзень, г. зн. прымусіць нашы машыны і сродкі вытворчасьці працаваць 360 дзён, а ня 300; гэта найвялікшая эканомія палітычных і бытавых мерапрыемстваў дасьць вялікі штуршок наперад па сацыялістычнаму шляху.

Посьпехі **калектывізацыі**, хуткая рэканструкцыя распыленых сялянскіх гаспадарак, якая патрабуе надзвычайнай увагі цяпер і якая пацьвярджае ўсю грандыёзнасьць нашага сацыялістычнага пляну, калі мільёны сялянства—беднаты і сераднякоў—адзіным крокам з пралетарыятам увязвае свае пляны з агульным плянам індустрыялізацыі краіны.

Селянін-бядняк і серадняк пераканаўся, што толькі пасьпяховая барацьба з кулаком, з прыватным капіталам магчыма праз сацыялістычныя формы—праз калгас.

Культурная рэвалюцыя, якая пачынаецца зьнізу з увядзеньнем абавязковага агульнага навучаньня, з ліквідацыяй няпісьменнасьці і масавай падрыхтоўкі кадраў для сацыялістычнага будаўніцтва—знаходзіць сваё вырашэньне ў форме моцнага пералому ў гэтай справе, зусім рэальна і моцна, асабліва сёлета.

Яна захоўвае ва ўсіх культурных пытаньнях цьвёрдую клясавую лінію, захоўвае бяз усякіх уступак партыйную ўстаноўку, што нашу нацыянальную палітыку мы праводзім, як «нацыянальную па форме і пралетарскую па зьместу», даючы рашучы адпор і выкрываючы ўсякія нацыянал-дэмакратычныя, шавіністычныя тэндэнцыі і прымірэнчыя адносіны да іх.

Яна шырока і глыбока ўкараняе інтэрнацыянальнае выхаваньне і разуменьне пытаньняў пралетарскай дыктатуры.

ПРЫЧЫНЫ ХАРЧОВЫХ ЦЯЖКАСЬЦЯЎ.

На сёньнешні дзень, ня гледзячы на пасьпяховае выкананьне кантрольных лічбаў першага году пяцігодкі, у нас ёсьць яшчэ шэраг цяжкасьцяў.

Адзэй з іх зьяўляецца тая супярэчнасьць, якая **выцякае з дробнаўласьніцкага характару вытворчасьці ў земляробстве**. Яна зьяўляецца ўсё яшчэ базай супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў сацыялістычнаму наступленьню.

Адсталасьць дробнай вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы ўзмацняе нашы цяжкасьці ў галіне харчовага забясьпечваньня гарадоў і сыр'явога снабжэньня нашай прамысловасьці.

Выхадам з гэтага становішча будзе толькі далейшае сацыялістычнае наступленьне ў сельскай гаспадарцы, далейшае пашырэньне калектывізацыі бядняцкіх і серадняцкіх сялянскіх гаспадарак, далейшае каапэраваньне вытворчых працэсаў у сельскай гаспадарцы і падпарадкаваньне іх развіцьця агульнаму сацыялістычнаму пляну.

Уступкі зараз, хоць і часовыя кулацкім элемэнтам вёскі—не паляпшаюць, а пагаршаюць бясспрэчна зьнішчэньне цяжкасьцяў.

Усякае кулацкае супраціўленьне цяпер павінна быць адхілена цьвёрдай пралетарскай рукой.

Усе нашы мерапрыемствы павінны садзейнічаць яшчэ большаму разьвіцьцю сацыялістычных элемэнтаў вёскі, адначасова дапамагаючы некаапэраваным сялянскім гаспадаркам беднаты і сераднякоў, штурхаючы іх блізупынна на шлях калектывізацыі.

Вось што толькі можа разбурыць тыя адставаньні, якія ёсьць у сельскай гаспадарцы.

Нашы кантрольныя лічбы на 1929-30 г. таму сьмела і рашуча выстаўляюць ахоп калектывізацыі сялянскіх гаспадарак замест цяперашніх 3,5 проц. пасеўнай плошчы да 11,6 проц., а увесь сацыялістычны сэктар—каля 13 проц.

Гэта зьяўляецца яскравым адбіткам генэральнай лініі нашай партыі ў праграме дзейнічаньня па калектыўнаму будаўніцтву вёскі.

Адначасова трэба наносіць моцны ўдар кулацкім хутаром, дробным пасёлкам і адрубам, дзе месьціцца прыватна-капіталістычнае супраціўленьне ў поўным сваіх росквіце, не даючы ім ня толькі ніякага росту, а памяншаючы іх, што зьяўляецца зараз самай неадкладнай задачай усіх нас.

Накіроўваючы ўзмоцнена сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронту супроць прыватна-капіталістычных элемэнтаў, мы больш яскрава, чым гэта было магчыма раней, здолеем праводзіць клясавую лінію па ўсіх пытаньнях і дзейнічаньнях.

Загатоўкі харчоў мы праводзім цяпер па пляну, даводзячы яго да сяла, абгаворваючы на сходах беднаты, пасьля на агульных сходах беднаты і сераднякоў і праводзім на справе лінію продажу ўсяго таварнага хлеба праз дзяржаўныя каапэрацыйныя органы.

А па кулацкіх гаспадарках даводзім плян да кулацкага двара—па прыгавару агульных сходаў беднаты і сераднякоў. Кулак у абавязковым парадку павінен прадаць пэўную колькасьць хлеба ў каапэрацыйныя і дзяржаўныя арганізацыі.

Вядома, кулак шукае ўсе шляхі для зьмякчэньня гэтай лініі. Ён шукае памоцніка ў гарадзкім спэкулянце і гандляру.

Ён уплывае на ўсякія элемэнты, якія хістаюцца, нават у нашай партыі, а ня толькі сярод гарадзкіх жыхароў.

Адгэтуль і права-апартуністычныя хістаньні пад дробна-буржуазна-прыватна-капіталістычным націскам.

Наша партыя па гэтаму пытаньню дала адказ, выкрыўшы ўсю небясьпеку гэтых „тэорый", „уступак" і капітуляцыі перад цяжкасьцямі і прыватна-капіталістычным націскам.

Ніякіх уступак не павінна быць і ніякага прымірэнцтва не дапусьцім, ніякіх ухілаў ад генэральнай ленінскай лініі пры вырашэньні гэтых пытаньняў.

ПРАКТЫЧНАЕ ВЫРАШЭНЬНЕ ХАРЧОВАГА ПЫТАНЬНЯ.

Наш хлебазагатоўчы плян у Беларусі пры росьце сельска-гаспадарчых прадуктаў па зернавых больш 11,6 пр. вызначан у разьмеры 114.800 тон ці 7.000.000 пуд. супроць 4 млн. пуд. у 1928-29 годзе.

З гэтай колькасьці ад сялянства павінна паступіць 41 тыс. тон, ад калгасаў—1 тысяч. тон, ад савгасаў 2,28 тыс. тон, намольн. збору 57,4 і ад кантрактацыі 13,2 тыс. тон.

Але гэтага недастаткова. Беларусь заўсёды карысталася завозным хлебам з другіх раёнаў Савецкага Саюзу.

Такі завоз вызначан намі каля 7,8 млн. пуд., пагоджан з Саюзам пакуль на 7 млн. пуд. завозу. Гэта колькасьць павінна нас вусім здаволіць па тых нормах, якія зараз вызначаны з пэрспэктывай магчымасьці павялічэньня, асабліва для рабочых.

Але гэта патрабуе абавязковага выкананьня загатоўчага пляну поўнасьцю. За першыя тры месяцы (ліпень-верасень) плян выкананы толькі на 86 проц. ці каля 18 проц. гадавога заданьня.

Зьмяншэньне стада маладняку адбылося ня толькі па БССР, але і па СССР па індывідуальнаму сельска-гаспадарчаму сэктару, з прычыны, галоўным чынам, кармавога крызісу; усё гэта выразна сыгналізуе аб зьмяншэньні мясных запасаў.

Уласныя беларускія загатоўкі недастатковы і завоз неабходны, для чаго і ўжыты сваечасовыя меры.

Умовы мясного рынку прымушаюць ужыць такія меры, каб праз дзяржаўныя гандлёвыя арганізацыі праводзіўся адкорм буйнай жывёлы ў зімовы час каля 4 тыс. галоў супроць 1200 галоў і каля 1000 шт. сьвіней.

Апроч таго, трэба арганізаваць для вясеньняга і летняга пэрыяду забясьпечаньне рабочага насельніцтва, асабліва будаўнікоў, салам і мясам—фонд каля 500 тон мяса і 500 тон сала.

Далей, для некаторай эканоміі мяса прыдзецца абавязкова практыкаваць гатаваньне ў сталоўках рыбы, грыбных страў з гародніны.

Не малое месца можа і павінна заняць у мясной справе птушынае мяса, кролік і кансэрвы, завоз якіх павінен быць узмоцнен значна больш, чымся зараз.

Па малаку і іншых малочных прадуктах—можна сказаць,—што па маслу мы бярэм стаўку на тое, каб загатовіць 2.217 тон, што дае павялічэньне на 1.017 тон, ці на 84 проц. На сыру—загатовіць 1030 тон, ці на 165 тон больш (19 проц.), чымся ў 1928-29 г.

Забясьпечаньне малаком рабочых арганізуем праз ЦРК—намечана ў разьмеры 15-16 т. тон, што дасьць нам магчымасьць праводзіць забясьпечаньне ў плянавым парадку каля 50 процантаў рабочага насельніцтва.

Ва ўсіх пытаньнях забясьпечаньня рабочага насельніцтва павінна быць моцна палепшана тэхніка абслугоўваньня, сем'і рабочых, якія маюць дзяцей, павінны атрымліваць малако ў першую чаргу. Павінна быць захавана чыстата і якасьць прадуктаў.

Мы павінны шырока разгарнуць гародныя і садовінныя гаспадаркі (арцелі, савгасы, калгасы) вакол гарадоў—павінны ўзьняць іх.

На цукру мяркуецца захаваць забясьпечаньне членаў ЦРК у тых жа нормах, як і зараз. Гэта дыктуецца неўраджаем буракоў, але затое мы павінны павялічыць завоз і загатоўку мёду і патакі.

Вакол гэтых пытаньняў павінна быць створана цяпер цьвёрдая плянавая дысцыпліна пры загатоўцы і разьмеркаваньні.

Ніякага паслабленьня ў разуменьні сур'ёзнасьці работы па загатоўцы харчоў ня можа быць.

Усякая дэмабілізацыя настрояў павінна каравацца, адкуль бы яна ні выходзіла.

Вакол харчовых пытаньняў мы будзем мець усялякія чуткі, правакацыі спэкулянтаў аб росьце цэн, зачыненьні рынкаў (як гэта было ў Менску), ня гледзячы на тое, што па ўсёй лініі мы цэны захоўваем ранейшыя, а на некаторыя рэчы нават зьніжаем, бо абавязкова трэба правесьці лінію на большае зьніжэньне кошту рабочага набору і гэтым узьняць яшчэ больш рэальны ўзровень зарплаты.

Сеяць паніку—гэта на карысьць спэкулянту і кулаку, гэта на карысьць ворагу савецкай улады і сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы стаімо зараз перад увядзеньнем дыфэрэнцыраванага клясавага пайка па галоўных прамых словых прадуктах для нармальнага задаволеньня рабочае клясы.

УсеЦСПС у сваім лісьце па гэтаму пытаньню зварочваецца з заклікам да рабочых і служачых, гаворачы, што ў гэтай рабоце прафсаюзы да апошняга часу не аддавалі дастатковай увагі пытаньням забясьпечаньня рабочых харчамі. Між тым актыўнасьць і настойлівасьць прафсаюзаў у галіне рацыяналізацыі гандлёвага апарату, у першую чаргу рабочай каапэрацыі, і ў галіне зьніжэньня розьнічных цэн, маглі-б, ня гледзячы на труднасьці ў загатоўках хлеба і іншых сельска-гаспадарчых прадуктаў, аказаць уплыў на палепшаньне забясьпечаньня і на рост рэальнай заработнай платы.

Трэба арганізаваць рабочы актыў для сыстэматычнага кантролю за работай каапэрацыі і органаў НК Гандлю на мясцох. (З лісту УсеЦСПС і ВСНГ СССР да калдагаворнай кампаніі).

Вось тыя мерапрыемствы, якія могуць і павінны разьвязаць цяжкасьці ў харчовым пытаньні, а ня рэцэптамі правых апартуністаў аб зьмяншэньні тэмпу індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Не. Наадварот. **Толькі выключна ў правядзеньні лініі партыі на шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі, пры жорсткай барацьбе з кулаком, нэпманам і гандляром, пры масавым удзеле саміх рабочых, бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі мы вырашым нашы харчовыя цяжкасьці.**

АБАВЯЗКОВА ВЫКАНАЦЬ УСЕ ПЛЯНЫ.

Калі наогул мы выканалі з перавышэньнем першы год нашай пяцігодкі, дык у некаторых галінах мы ўсё-ж не дабіліся таго, чаго чакалі. **Зьніжэньне сабекошту** было намечана на 7 проц., а дасягнута 4,5 пр.; **зьніжэньне будаўнічага індэксу** было намечана ў 15 проц., а дасягнута толькі 7—8 проц.

На будучы год трэба дабіцца зьніжэньня сабекошту на **10 проц.**, і па будаўнічаму індэксу прамысловасьці—на 15 проц.

Калі мы ў мінулым годзе і выканалі прамплян пры невыкананьні зьніжэньня сабекошту, дык гэта было часткова і за кошт вялікіх фінансавых цяжкасьцяў у першым паўгодзьдзі і да канца году, за кошт некаторых няўлічаных унутраных сродкаў прамысловасьці, за кошт некаторага пагоршаньня якасьці, што зусім недапусьціма. Аб гэтым мы павінны абавязкова зараз папярэдзіць усіх.

Мы павінны напружыць усе сілы і ўвагу на гэтыя ўдарныя задачы, якія фактычна забясьпечваюцца ўжо тым уздымам, які мы маем па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Мы будуем гарады, памяшканьні, фабрыкі і заводы. Насельніцтва прырастае і патрабуе ўсё больш і больш прамтавараў і памяшканьняў. Усё гэта магчыма задаволіць толькі тады, калі мы выканаем сапраўды ў 100-процантным разьмеры ўсе паказальнікі па прамысловасьці і будаўніцтву.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА—МАГУТНЫ СРОДАК ВЫКАНАНЬНЯ.

У сацыялістычным спаборніцтве павінна прымаць актыўны ўдзел уся прамысловасьць, кожны рабочы і кожны спэцыяліст.

Сацыялістычнае спаборніцтва, як вышэйшая форма арганізацыі актыўнасьці мас, зьяўляецца магутным рычагом у справе барацьбы з прагуламі, п'янствам, хуліганствам, недысцыплінаванасьцю і разбэшчанасьцю.

Наша зада ў сацыялістычным спаборніцтве: Пашырыць і паглыбіць яе, улічыць ступень выкананьня дагавораў, праверыць якасьць прапрацоўкі ўсіх паказальнікаў спаборніцтва, удасканаліць самы вучот і спрасьціць яго, зьнішчыць прычыны, якія перашкаджаюць выкананьню дагавораў (сыравіна, тэхніка і арганізацыя), выявіць усе нездаровыя зьявішчы ў вытворчасьці, улічыць эфэкт работы ўдарных рабочых брыгад.

Акрамя гэтага, трэба зьвярнуць увагу на абмен вопытам пры спаборніцтве, на арганізацыю ўзаемнага тэхнічнага шэфства, прыцягнуць больш тэхнічных сіл да спаборніцтва, устанавіць і прывесьці індывідуальнае і калектыўнае прэміраваньне пры спаборніцтве.

І, нарэшце, яшчэ раз праверыць наколькі **наш заводзкі „трыкутнік" — дырэктар, ячэйка і завком—выконвае дырэктыву нашай партыі, аб мерах па ўпарадкаваньню кіраваньня вытворчасьцю і ўстанаўленьня адзінаначальля.** Ня ўсюды аб гэтым дастаткова ведаюць і праводзяць у жыцьцё.

ПЕРАХОД НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ І АДЗІНАНАЧАЛЬЛЕ.

Сацыялістычнае будаўніцтва і сацыялістычнае плянаваньне патрабуе правільнага размеркаваньня сіл, дзе-б яны ні былі, а асабліва ў нашай сацыялістычнай прамысловасьці.

Ленін адносна гэтага пісаў так:

„Трэба навучыцца злучаць разам бурны, мітынгавы дэмакратызм працоўных мас, які б'е праз край, з жалезнай дысцыплінай у часе працы, з няўхільным падпарадкаваньнем волі аднэй асобы—савецкага кіраўніка ў часе працы" (Ленін. „Очередные задачи советской власти", том XУ).

Але затое асабліва разнастайнымі павінны быць формы кантролю зьнізу.

„Чым больш рашуча мы павінны стаяць зараз за бязьлітаснацьвёрдую ўладу, за дыктатуру паасобных асоб для пэўных працэсаў работы, у пэўныя моманты чыста выканаўчых функцый, тым больш разнастайнымі павінны быць формы і спосабы кантролю зьнізу". (Ленін. „Очередные задачи советской власти", том XУ).

Устанаўленьне **адзінаначальля**, гавораць некаторыя з ворагаў нашых па свойму, у карысьць сваёй „тэорыі" і нават контррэвалюцыйных мэтаў, як аб устанаўленьні «старых часоў», аб старых гаспадарах і г. д.

На гэта кожны сьвядомы рабочы павінен даць рашучы адпор.

Пастанову аб пераходзе на **бесперапынны рабочы тыдзень, увядзеньне адзінаначальля, правільнага разьмеркаваньня сіл і адказнасьць усіх арганізацый на заводзе і на прадпрыёмствах мы павінны вітаць бяз усякіх ваганьняў і даць рашучы адпор усім жадаючым перашкаджаць правядзеньню гэтых неабходных і правільных пастаноў савецкай улады і партыі.**

Па гэтаму пытаньню мы маем зусім правільны заклік і кіруючыя ўказаньні нашай партыі, перададзеныя праз прафэсыянальныя саюзы, і яны гавораць так:

„Поруч з узмацненьнем работы прафсаюзаў па абароне матар'яльных, бытавых і культурных патрэб рабочых і служачых, злучаючы і ўвязваючы гэту работу з агульнымі інтарэсамі і задачамі рабочай клясы, прафэсыянальныя і гаспадарчыя органы павінны рашуча змагацца з адсталымі, часам рвачаскімі настроямі паасобных груп рабочых, даваць рашучы, бальшавіцкі адпор вылазкам контррэвалюцыйных элемэнтаў, рэшткам трацкізму і правым апартуністычным настроям, абапіраючыся ў гэтай барацьбе на перадавыя актыўныя пласты рабочых". (З лісту Усе ЦСПС і ВСНГ СССР).

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ НОВЫХ ЧЫРВОНЫХ КАДРАЎ ДЛЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Калі мы раней стаялі перад беспрацоўнай арміяй, нават з кваліфікаваных рабочых, дык зараз ужо назіраецца нават недахват рабочых простай фізычнай працы.

Наш дзяржаўны апарат патрабуе таксама ўзмоцненага арабочваньня.

Для ўсяго гэтага ўзьнята шырокая кампанія па вылучэньню рабочых на адказныя кіруючыя пасады ў савецкім апараце, што зьяўляецца найпершай і неабходнейшай задачай, бо чым больш мы вылучым з рабочага асяродку работнікаў у апарат, тым лепш зьнішчым бюракратызм.

Чым больш мы пашлём рабочых і сялянскай беднаты ў ВУЗ'ы і ВТУЗ'ы, чым больш мы падрыхтуем чырвоных новых спэцыялістаў, тым больш мы будзем гарантаваны ад таго „спэца" шкодніка, якіх было ня мала і зараз яшчэ дзе-ні-дзе ёсьць і ня выцягнуты на сьвет пралетарскага сонейка.

Чым больш мы здолеем падрыхтаваць сялян з беднаты для сельскай гаспадаркі, як кіраўнікоў па калектывізацыі, сацыялістычнай рэканструкцыі і г. д., тым менш у нас будзе прабелаў і кулацкай правакацыі і кулацкіх ухілаў вёскі.

Вось чаму асабліва гэты год прад'яўляе вялікія патрабаваньні нашаму пляну па частцы вылучэньня, па падрыхтоўцы спэцыялістаў з рабочага асяродку.

Мы для гэтага вызначаем спэцыяльныя стыпэндыі і дапамогу рабочым і сялянам з беднякоў і сераднякоў, каб яны маглі папасьці ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Вячэрні рабфак павінен пашырыцца, рабочыя слухачы павінны аслабаніцца ад пэўнай часткі работы для паведваньня школы.

Вытворчыя нарады на заводах і прадпрыёмствах павінны на будучы час працаваць больш актыўна і энэргічна.

Наша вынаходніцтва павінна значна вышэй паставіць сваю работу.

НЕ ПЕРААЦЭНЬВАЦЬ ДАСЯГНЕНЬНІ, НЕ ПЕРАЎВЯЛІЧВАЦЬ НЕДАХОПЫ.

Так, не пераацэньваючы нашых сацыялістычных дасягненьняў, але і не пераўвялічваючы нашых цяжкасьцяў, мы можам сьмела сказаць, што мы наступаем па ўсяму фронту сацыялістычнага будаўніцтва.

Капіталістычныя элемэнты павінны адступаць, ня гледзячы на іх шалёнае супраціўленьне, якое выліваецца нават у стрэлы з-за вугла, падпалы, правакацыі, шкодніцтва. З гэтымі не адзінкавымі фактамі змагацца—у пралетарыята рука не здрыгане. Няхай аб гэтым падумае любы контррэвалюцыянэр, кулак і г. д.

Нашы посьпехі не вызваляюць нас ад напружанасьці ў рабоце, а наадварот, павялічваюць гэту напружанасьць, бо тэмп—шпаркасьць павінны ўсё расьці і расьці і адхіліць літаральна ўсе буржуазныя прадказаньні аб няўдачах савецкай улады.

Пакуль што мы толькі даганяем капіталістычныя дзяржавы ў сваім разьвіцьці вытворчасьці Але наш лёзунг **ня толькі дагнаць, але і перагнаць.**

Вось чаму асабліва высокая пралетарская дысцыпліна і вытрымка павінны быць у нашай рабоце на другі год пяцігодкі.

Кантрольныя лічбы на 1929-30 год, зацьверджаныя СНК, адобраныя нашай партыяй прасякнуты баявым духам клясавай лініі партыі, яны правільна ўлічваюць умовы клясавай барацьбы ў нашай краіне.

Усе гэтыя лічбы ў кантрольных лічбах і сацыялістычная іх сутнасьць павінны быць усьвядомлены ўсёй рабочай клясай, усім працоўным калектывам нашай краіны.

Нашы посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве не павінны зьменшыць пралетарскую дбайнасьць. Ніякай зразумеласьці, ніякага супакоеньня. Больш праверкі ўсёй нашай практыкі. Лёзунг самакрытыкі, уваслабляючай заклік да крытычнай праверкі ўсёй нашай работы зьнізу да верху—ёсьць шлях да хуткай перамогі рабочай клясы і ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Больш энэргіі на справу выкананьня пяцігодкі.

(Са спрэчак па дакладу т. Каркліна).

Пасьля дакладу т. Каркліна разгарнуліся шырокія спрэчкі, якія занялі частку вячэрняга пасяджэньня ў суботу і большую частку дзённага ў нядзелю.

Адзін за адным выходзілі рабочыя на трыбуну, каб заявіць што ўсе цяжкасьці сучаснага пэрыяду ім зразумелы, і яны рабочых не палохаюць. Яшчэ з большым напружаньнем, яшчэ з большым тэмпам рабочыя будуць весьці працу на сваіх прадпрыемствах. Усе рабочыя трымаюцца аднэй думкі, што кантрольныя лічбы 1929-30 году будуць выкананы з посьпехам.

— Тое, што 5-цігодку мы выканаем за 4 гады, мы можам упэўніцца ня толькі на лічбах пляну,—кажа рабочы фабр. „Октябрь" т. Гелер,—але і на жыцьці. Мы, кажа ён, бачым новапабудаваны камбінат у Бабруйску, нашу новую фабрыку Меншвэю „Акцябр" і шэраг іншых новых пабудоў. Усё гэта яскрава сьведчыць, якімі хуткімі крокамі мы ідзем наперад.

Рабочы-будаўнік Унівэрсытэцкага гарадка т. Барсук заклікае абвясьціць самую рашучую барацьбу ўсялякім ухілам ад лініі партыі, усім расратчыкам і варожым элемэнтам у нашых установах, бо ўсе яны перашкаджаюць нашаму будаўніцтву, спрабуюць сарваць нашы будаўнічыя пляны.

Многія таварышы зьвярталі ўвагу на тое, што мы мала клапацімся аб выхаваньні новых кадраў рабочых; трэба фарсіраваць будаўніцтва клюбаў, каб можна было весьці шырокую культасьветную працу і выхаваць новыя кадры.

— Усе цяжкасьці нам вядомы, вядомы і іх прычыны,—кажа рабочы заводу „Комунар" т. Марчэнка,—пашы посьпехі бачыць ня толькі „зрячий", але іх адчувае і сьляпы на кожным кроку нашага жыцьця.

Дысанансам прагучэла на канфэрэнцыі выступленьне рабочага-будаўніка з пабудовы сельска-гаспадарчай выстаўкі т. Аўгулевіча, які за цяжкасьцямі ня ўбачыў нашых дасягненьняў, ня ўбачыў будаўніцтва новага жыцьця, і для якога ўвесь сэнс жыцьця—як адзначыў адзін з выступаўшых пасьля яго рабочых, заключаецца ў клопатах аб страўніку.

Рабочыя рэзка адмежаваліся ад выступленьня Аўгулевіча. Рабочы-будаўнік будаўніцтва Унівэрсытэцкага Гарадка т. Ваявода ад імя рабочых апошняга заявіў:—Мы пратэстуем супроць выступленьня Аўгулевіча. Мы ўсе недахопы пытаемся зьнішчыць, і ніякія цяжкасьці нам ня страшны. Рабочыя гатовы яшчэ на большыя цяжкасьці, каб хуткімі крокамі ісьці да сацыялізму. Тав. Ваявода і шэраг іншых рабочых ацанілі выступленьне Аўгулевіча, як выступленьне ныціка. Мы, —кажуць шэраг прамоўцаў,—будзем рашуча змагацца з усімі ныцікамі, хто-б яны ні былі.

Сьвядомая маса беспартыйных рабочых заўсёды ішла і будзе ісьці за авангардам рабочае клясы—за камуністычнай партыяй, і ніякія ныцікі нас не адхіляць з правільнага бальшавіцкага шляху,—вось адназгодны голас усіх прамоўцаў усёй канфэрэнцыі.

— Шляхам шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва,—кажа работніца хлебазаводу т. Мазалеўская,—мы пераможам усе цяжкасьці і ўзмацнім яшчэ больш тэмп нашага будаўніцтва.

Бурнымі воплескамі канфэрэнцыя сустрэла паведамленьне аб тым, што ў залі знаходзіцца т. Домбаль. Тав. Домбаль запрашаецца ў прэзыдыум. У часе дзённага пасяджэньня т. Домбаль выступіў з прамовай, якую мы даём сёньня ў скарочаным выглядзе.

У часе дзённага пасяджэньня канфэрэнцыю прышоў вітаць атрад „Асаавіяхімаўцаў" заводу "Дрэваапрацовачнік"; делегаты заявілі, што рабочыя-дрэваапрацовачнікі правяраюць, наколькі яны ў любую хвіліну гатовы стаць з вінтоўкай у руках на абарону заваёў Кастрычніка. Праверка паказала, што рабочыя добра ўмеюць трымаць вінтоўку ў руках.

На вячэрнім пасяджэньні быў абгаворан даклад т. Розіна аб пераходзе прамысловасьці на бесперапынны тыдзень.

Шырэй крытыку ўсіх нашых недахопаў.

(З ПРАМОВЫ ТАВ. ДОМБАЛЯ).

— Ваша канфэрэнцыя лішні раз пераконвае, што гаспадаром краіны Саветаў зьяўляецца рабочая кляса. Ваша канфэрэнцыя прысьвечана самым актуальным, самым цэнтральным пытаньням сацыялістычнага будаўніцтва. Вы павінны ўскрыць усе недахопы, якія ёсьць у вашым будаўніцтве, але, ускрываючы гэтыя недахопы, адзначаючы цяжкасьці

ШЫРЭЙ ФРОНТ БАРАЦЬБЫ.

За чыстату партшэрагаў, за клясава-вытрыманы савецкі апарат, супроць скрыўленьняў лініі партыі.

Праверка і чыстка савецкіх ячэек.

ПРАВЕРКА ЯЧЭЙКІ ПАЖАРНАЙ КАМАНДЫ ВЫЯВІЛА СКЛОКІ, ХАВАНЬНЕ БЮРАКРАТЫЗМУ, АДСУТНАСЬЦЬ ПАРТВЫХАВАЎЧАЙ ПРАЦЫ. ПАСЬЛЯ ЧЫСТКІ ЯЧЭЙКА З НОВЫМІ СІЛАМІ ВОЗЬМЕЦЦА ЗА ПРАЦУ.

Самакрытыка была ў загоне.

Праведзеная работа па праверцы і чыстцы ячэйкі пажарнай каманды, якая праходзіла пры актыўным удзеле членаў ячэйкі і беспартыйных рабочых, дасканальна выявіла становішча ячэйкі і якасны склад яе членаў.

Чыстка праходзіла пры разгорнутай самакрытыцы. Сем пасяджэньняў праверкому наведвалі 65-70 чал. беспартыйных рабочых і служачых. Па дакладу сакратара ячэйкі выказалася 26 чалавек. За час праверкі 23 камуністых было 121 выступленьне, з якіх—50 выступленьняў было з боку беспартыйных. Трэба адзначыць, што самакрытыка насіла недастаткова здаровы характар. І былі моманты склочніцтва і жаданьня помсты на глебе асабістых рахункаў.

6 кастрычніка па заключным пасяджэньні праверкомам абвешчаны вынікі. У выніках дан упаўне правільны і глыбокі аналіз становішчу і рабоце ячэйкі. Гэтыя вынікі на доўгі час застануцца галоўнейшай дырэктывай у пасьледуючай рабоце ячэйкі.

Унутрыпартыйнае становішча ячэйкі было вельмі кепскае, адсутнічала партыйная дысцыпліна, ня было здаровых таварыскіх узаемаадносін і склокамі былі ахоплены ўсе яе члены, у тым ліку і значная частка членаў бюро ячэйкі. На моманты бюракратызму з боку адміністрацыі ячэйка не рэагавала. Група партыйцаў Салаўёў, Ціханкоў, Маляўка пакрывала бюракратызм былога начальніка Гіпдзіна, які зьнят з працы па пастанове РСІ, апраўдала зажым самакрытыкі заахвочваньне ў камандзе падхалімства і іншыя праступкі. Адміністрацыя ў юбілейныя дні абвяшчала „гэроямі працы“ былых гарадавых. Ячэйка адносілася да гэтага прымірэнча, да голасу рабочых не прыслухоўвалася і з іх думкай ня лічылася.

Адзначаныя хваравітыя зьявішчы мелі месца на працягу вельмі доўгага часу, аднак Фрунзаўскі Райком на гэта своечасова не рэагаваў, і толькі ў канцы красавіка месяца гэтага году па пастанове Райкому было пераабрана датэрмінова бюро ячэйкі і прымацавана да ячэйкі некалькі больш партыйна моцных таварышоў. Гэтае мерапрыемства ўнесла частковае аздараўленьне ў ячэйцы і пералом у яе рабоце. Але яшчэ і да апошняга часу неразгорнута самакрытыка і сярод рабочых ёсьць моманты балязні крытыкаваць. Ня гледзячы на спрыяючыя ўмовы для працы ў камандзе, масавая работа належна ня ўзьнята. Калі па праведзеным за летні час палітычным кампаніям як падпіска на III пазыку індустрыялізацыі, адпрацоўка дня ў карысьць індустрыялізацыі, збор сродкаў на падарункі для ДУ Чыр. арміі, адлічэньне 1 проц. у фонд абароны ёсьць здавальняючыя вынікі, дык слаба вядзецца работа па растлумачэньню пытаньняў, якія высоўваюцца рабочымі і няма глыбокай прапрацоўкі сярод партыйцаў і беспартыйных рабочых галоўнейшых рашэньняў партыі. Няма вынікаў у справе выкананьня дагавору сацыялістычнага спаборніцтва па ўзмацненьню працдысцыпліны-прагулы і спазьненьні на працу, якія не зьмяншаюцца,—а застаюцца стабільнымі на працягу апошніх 6 месяцаў. У барацьбу з бюракратызмам недастаткова ўцягнуты яшчэ рабочыя масы.

На моманты праяўленьня правага ўхілу ячэйка своечасова рэагавала, але небясьпека правага ўхілу ў партыі, яго сацыяльныя карэньні засталіся незразумелымі для часткі камуністых, асабліва для тых, якія нядаўна ўступілі ў партыю. Да апошняга часу меліся моманты неэтычных учынкаў асобнымі камуністамі.

З 23 праверэных—3 чал. выключаны з партыі і 5 чал. атрымалі партыйнае спагнаньне. Чыстка аздаравіла ячэйку, адсеяўшы з яе некамуністычных, разлажыўшыся элемэнтаў.

Камісія ў сваіх выніках адзначыла, што ячэйка ў сваей рабоце за апошні час правільна праводзіла партыйную лінію і пасьля чысткі ў сваім складзе праводзячы партыйную лінію яна выправіць усе недахопы.

Я. Івашын.

ЧАЛАВЕК З ПАРТФЭЛЕМ.

Мінулае Ганцэвіча губляецца недзе ў глыбокай патаемнасьці. Перад намі ён паўстае ў ролі старшыні ЖАКТ'а № 8 (Менск).

„Дзейнасьць“ Ганцэвіча характарызуецца безгаспадарчасьцю і бессыстэмнасьцю. У сваёй працы ён дапушчаў шмат грубых памылак, недарэчнасьцяў. Затое ён асабліва ўмела зарабляў сабе «на непрадугледжаныя выдаткі».

Ганцэвіч выдумваў розныя непрадугледжаныя каштарысы і рахункі, якія зусім непатрэбны. Ён падрыхтоўвае сам (ня будучы тэхнікам) розныя праэкты пабудоў, за што атрымлівае адпаведныя грошы. А пасьля для ўняменьня «тэхнічных паправак» ён аддае перарабляць праэкты... спэцыялісту.

Хітры ашуканец Ганцэвіч здолеў наладзіць справу так, што ніхто да апошняга часу ня ведаў аб гэтым, бо кантролем быў... той-жа Ганцэвіч.

Здабыўшы партфэль, Ганцэвіч пачаў будаваць свой дабрабыт. Пры разьмеркаваньні кватэр ён на першы плян высоўвае свае асабістыя патрэбы; адпушчае, згодна «дырэктыў» ЖАКТ'у, сабе найлепшую кватэру. Пры гэтым Ганцэвіч бясплатна карыстаўся кватэрай.

За час прабываньня ў Жакце Ганцэвіч растраціў, такім чынам, звыш 1000 руб. Адчуваючы, што яго могуць выкрыць, ён кідае працу і паступае на пасаду заг. лясным складам Белжылсаюзу, але і тут ён працаваў кепска.

У самы разгар будаўнічых работ член партыі Ганцэвіч кідае сваю пасаду і пераводзіцца ў каўбасную арцель.

— Задарма,—скардзіцца ён,—не магу працаваць. За 110 рублёў ня буду служыць!..

Вось яны факты, якія характарызуюць «партыйца» Ганцэвіча, які чамусьці дагэтуль «мірна адпачывае на лаўрах». Трэба, каб ім зацікавілася ў першую чаргу камісія па чыстцы, а таксама—і пракуратура.

М.

Вынікі чысткі—на прагляд мас

КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ САВЕЦКАГА АПАРАТУ І РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ ПРАЦУЮЦЬ БЕЗ КІРАЎНІЦТВА І ДАПАМОГІ.

Вынікі чысткі трэба паставіць на абгаварэньне рабочых, батракоў, беднаты і серадняцтва.

ШЫРЭЙ УЦЯГНУЦЬ МАСЫ.

(Увазе камісій па чыстцы савецкага апарату ў раёнах).

Праведзеная па некаторых раёнах БССР чыстка апарату ў ліку сваіх недахопаў мае яшчэ той недахоп, што вынікі работы камісій па чыстцы недаводзіліся да ведама шырокіх мас працоўных, не абгаварваліся на сходах і не папраўляліся. Некаторыя камісіі не рабілі гэтага сьвядома і абгрунтоўвалі так—камісія, якая чысьціць установы ў раёне, ня мае права выносіць канчатковыя і абавязковыя пастановы аб асобах, бо рашэньне камісіі зацьвярджаецца кіруючай акруговай камісіяй пры РСІ і толькі пасьля гэтага рашэньні маюць моц і павінны выконвацца. Раз гэта так, мяркуюць некаторыя, дык чаго-ж нам дакладваць аб сваёй рабоце, калі яна патрабуе далейшага зацьверджаньня. Гэткае меркаваньне памылковае і шкоднае. Камісія па праверцы і чыстцы ўстаноў павінна аб сваіх рашэньнях адносна асоб (каго зволіць, за што, што яму забараніць і г. д.) далажыць на масавых сходах працоўных для таго, каб маса мела магчымасьць ацаніць праведзеную работу і зрабіць свае папраўкі.

Хіба можам мы ў такой справе абыйсьці масы. Хіба маса, абгаварваючы меркаваньні камісіі, ня зможа ў парадку самакрытыкі і на карысьць агульнай працы ўнесьці свае заўвагі, якія кіруючая акруговая камісія пры зацьверджаньні рашэньняў камісіі па чыстцы ўлічыць і на падставе якіх зможа ўнесьці і папраўкі да праэктаў камісіі па чыстцы.

Правесьці па раёну вялікую работу, ускалыхнуць масу і тут-жа зараз не сказаць, што мы мяркуем рабіць—гэта самы бюракратычны падыход да справы. Калі ўжо будзе канчатковае рашэньне Кіруючай Акр. Камісіі—тады пастаноўка дакладаў на масавых сходах будзе насіць характар інфармацыі аб нашых рашэньнях. Зразумела, што і такія даклады карысны і неабходны і ў такіх выпадках магчыма і неабходна крытыкаваць і папраўлянь памылкі, але лепш за ўсё гутарыць з масай да вынясеньня канчатковых рашэньняў, каб улічыць, паўтараю, паказаньні, заўвагі, прапановы. Акрамя таго, адкладваньне дакладаў да зацьверджаньня ў кіруючай акруговай камісіі зацягнецца на некалькі месяцаў ад самой чысткі. Самае лепшае рабіць тое і другое: ставіць даклады камісіі па чыстцы аб выніках (як меркаваньне камісіі), а потым пасьля зацьверджаньня вынікаў у кіруючай камісіі даклады-інфармацыі.

Зразумела, у кожным населеным пункце даклады правесьці нельга, трэба абмежавацца некалькімі больш буйнымі, скарыстаць усялякія канфэрэнцыі, пленумы і г. д., але неабходна як мага шырэй асьвятліць перад масамі работу, праведзеную камісіяй па чыстцы. Трэба яшчэ памятаць, што камісіі па чыстцы ўстаноў павінны абгаварыць і выносіць тыя альбо іншыя рашэньні наконт работы самага апарату наогул. Такія-ж пытаньні цалкам прадстаўляюць вялікую каштоўнасьць для той масы, сярод якой працуе дадная ўстанова. Па такіх пытаньнях тым больш неабходна масы ўцягваць у абгаварэньне, а ня толькі прыцягваць да „слуханьня“ канчатковых рашэньняў. Толькі трэба пры пастаноўцы дакладаў камісій па чыстцы папярэджваць, што вынікі не канчатковыя і яны павінны зацьвярджацца ў акруговай камісіі.

Ф. Жуная.

Без кіраўніцтва.

Аб ходзе падрыхтоўчай работы па чыстцы савапарату ў Клічаўскім раёне.

Месяцаў некалькі таму назад па ўсяму раёну была праведзена даволі значная работа па растлумачэньню задач чысткі савапарату. Па даных райкамісіі садзейнічаньня праведзена 227 сходаў, пачаў ужо паступаць і матар'ял (маецца ўжо каля 150 заяў), ёсьць заявы з далёкіх вёсак на працаўнікоў РВК, лясьніцтва, сельсаветаў, каапэрацыі. Але-ж бяда ў тым, што ўся гэта праведзеная праца зусім ня была замацована—пасьля гэтых дакладаў усё нібы заглохла. Пагаварылі і ўсё... камісія чакала заяў.

Нічога ня было зроблена па смотру ўстаноў—хаця невялічкая спроба ў гэткім напрамку была. Матар'ял устаноў, якія абследжаны, зусім не адпавядае патрэбным задачам і агляды правадзіліся фармальна без усякага ўдзелу шырокіх мас. Ня былі створаны брыгады і аглядавыя камісіі і зразумела, што грунтоўная задача—агляд і кантроль апарату—засталася без увагі.

Райком КП(б)Б хаця і ставіў у сябе некалькі раз пытаньне, даваў дырэктывы, але-ж ня здолеў сканцэнтраваць увагу ўсёй партарганізацыі па пытаньні чысткі. Партячэйкі на месцы яшчэ не зьяўляюцца арганізатарамі гэтай працы, гэта, кажуць, справа савецкая і ніразу райком КП(б)Б ня выклікаў на свае пасяджэньні сэкратароў ячэек з дакладамі аб іх рабоце па чыстцы. (Тут мне хочацца сказаць, што недахопам у справе кіраўніцтва зьяўляецца і тое, што і АКК і акругком КП(б)Б не заслухоўвалі дакладаў райкомаў аб іх кіраўніцтве чысткай, АВК таксама ня выклікаў РВК з дакладамі аб падрыхтоўцы да чысткі).

У апошнія дні, праўда, райком КП(б)Б і РВК некалькі ўзмацнілі работу і вось аб асобных недахопах замечаных на ходу гэтай работы і трэба сказаць:

Вызначана 16 чалавек для кіраўніцтва брыгадамі, некаторыя з іх прыступілі да працы па арганізацыі брыгад.

Большасьць брыгад яшчэ не арганізавана, а ў некаторых мясцох утвораныя брыгады нікім не абіраліся, а намечаны партячэйкай, што, бязумоўна, няверна. Быў і такі факт, калі вызначаная брыгада для абгляду Усохскага і Запольскага сельсаветаў праводзіла работу, а сельсавет аб выніках нічога ня ведаў; бязумоўна, прыдзецца гэту работу пачынаць спачатку.

Яшчэ нічога ня зроблена і ніхто не займаецца падрыхтоўкай замены вычышчаных, а калі прыдзецца замяніць (а замяніць прыдзецца), то будзе цяжкавата.

Ужо распрашаваны, але як высьветлілася, многія сельсаветы атрымалі арыентыровачны плян чысткі і прышлі іх да справы.

Кампрамэнтуючы матар'ял вельмі мала паступае непасрэдна ад членаў партыі, камсамольцаў і саміх працаўнікоў апарату; маецца такі настрой, што: „нас будуць чысьціць“. Тут яшчэ не зразумелі, што праводзіцца генэральны абгляд работы ўсяго нашага апарату. Гэта застаўляе нас задумацца па-першае: аб кіруючай ролі партыйцаў у час самай чысткі і па-другое аб удзеле саміх працаўнікоў апарату ў чыстцы.

Я. Ізакаў.

АГОНЬ ПА КУЛАЦКІХ І НЭПМАНСКІХ ПРЫХІЛЬНІКАХ.

Абаронцы кулацкіх інтарэсаў.

(Бярэзінскі райён, Меншчына).

На пасяджэньні прэзыдыуму Брадзецкага сельсавету доўга спрачаліся, як быць з кулацкімі гаспадаркамі, якіх сельсавет не аблажыў індывідуальна. Некаторыя члены сельсавету прапанавалі паведаміць аб гэтым райвыканком, другія лічылі, што трэба зараз-жа аблажыць самім, але нарэшце выступіў сэкратар ячэйкі КПБ тав. Шпак, які сказаў, што самім абкладаць, альбо паведамляць райвыканком ня трэба, бо будзе вялікая няпрысмнасьць, тым больш, што гэтыя гаспадаркі нельга лічыць кулацкімі. Сэкратар ячэйкі сказаў,—сельсавет згадзіўся, а гаспадаркі, якія маюць па 20 дзесяцін зямлі, па 6-8 кароў, па 3 коняй, карыстаюцца сталай наёмнай працай, як Кашкан Удадзімір, які раней меў 100 дзесяцін зямлі,—жывуць і ў вус ня дуюць, прычым хваляць Шпака як „сумленнага партыйца“.

Пытаньне хлебазагатовак таксама пад „ідэйным“ кіраўніцтвам і ўстаноўкай сэкратара ячэйкі і сельсавета—праходзіць пад лёзунгам—**„Хто сколькі дасьць“**. Мы бачым, што сапраўдныя беднякі і сераднякі здаюць па 7-10 пудоў, а тыя, якіх Шпак і сельсавет абараняў ад індывідуальнага абкладаньня падаткам, здаюць толькі па 2-3 пуды.

Такая палітыка хлебазагатовак знойдзена і ў Пераворскім сельсавеце.

Выкрыта пры дапамозе сходаў груп беднаты па гэтых двух сельсаветах 28 кулацкіх гаспадарак не абкладзеных індывідуальным падаткам. Выкрыта, што тыя гаспадаркі, якія здавалі па 2-3 пуды, могуць здаць па 80-100 пудоў лішкаў хлеба. Беднота патрабавала аблажэньня кулацкіх гаспадарак індывідуальным падаткам і здачы лішкаў хлеба па 80-100 пудоў.

Менскаму АКК і Бярэзінскаму РК КПБ неабходна пацікавіцца кіраўніцтвам сэкратара ячэйкі Шпака, якога камісія па чыстцы заставіла ў шэрагах КПБ. Ці ня трэба было-б яго яшчэ раз пачысьціць?

Нам здаецца, што трэба.

П. Асіпчык.

Кулацкія прыхільнікі і злачынцы

Цяпер, калі працоўныя масы вядуць упартую працу па выкананьню пяцігадовага пляну будаўніцтва народнай гаспадаркі, ёсьць такія асобы, якія перашкаджаюць нашаму будаўніцтву.

Вось аб такой асобе мы пагаворым.

У часе чысткі вясковых ячэек у Смалявіцкім раёне быў выключаны з партыі сэкратар Пліскай ячэйкі УсеКП(б) Сінаўскі, які быў супроць калектывізацыі і будучы загадчыкам млыну падрабляў квіткі, прысвайваў збожжа, атрыманае ад сялян за размол, п'янстваваў, вёў распутнае жыцьцё, парушаў пастановы ўлады і т. д.

У гэтай-жа ячэйцы быў выключаны з партыі і старшыня Пліскага сельсавету—Гнёт, які выступаў супроць калектывізацыі, трымаў сувязь з кулакамі, а беднату перааблажыў і ў часе вучоту аб'ектаў абкладаньня па с.-г. падатку ўтаіў сам 3 дзес. зямлі і некалькі штук жывёлы.

Вось „службовы сьпіс“ гэтых грамадзян.

Тут ня толькі парушэньне статуту партыі, але і крымінальныя ўчынкі. Як вы назавеце інакш—укрыцьце аб'ектаў абкладаньня самім старшыней с.-с., або падроб квіткоў загадчыкам млыну?

Відома, што гэта—злоўжываньні і растраты. Так, відома, што Сінаўскі за кароткі час службы у млыне—жыў не па сродках, п'янстваваў і набыў матор-рухавік за 800 р.

За такія ўчынкі належыць ня толькі гнаць з шэрагаў УсеКП(б), але і садзіць у турму. Думаеце, ужо даўно сядзіць у турме Гнёт і Сінякоўскі? Нічога падобнага. Яны, праўда, сядзяць... але толькі на сваіх мясцох: адзін—старшыня с.-с. і цяпер, а другі—загадчыкам млыну.

Камісія па чыстцы выключыла іх з партыі, а райком сваё слова не сказаў і з працы іх ня зьняў. Няхай шкодзяць. А пад суд Сінаўскага і Гнёта аддаваць і ня думаюць. Пажываюць сабе хлапцы, як ні ў чым ня бывала і твараць сваю „справу“. Ці „блудзіць“ цяпер Сінаўскі—мы ня ведаем, але кажуць, што квіткі падрабляць так і ня кінуў. А пра Гнёта ведаем, што ён сарваў суботнік у калгасе і ўсякімі спосабамі шкодзіць калектывізацыі.

Акрамя таго, Гнёт і цяпер, дзякуючы свайму службоваму становішчу, крыўдзіць беднату.

Затое Гнёт—вялікі прыхільнік заможнікаў-кулакоў—Жукоускага, Папковіча С. і Кавэцкага.

Калі падалі Гнёту заяву, што ў Кавэцкага схавана ад вучоту 3 дзес. зямлі, дык Гнёт паклаў заяву ў кішэню, а пасьля пад сукно.

Сяляне як у часе чысткі ячэйкі, так і на сходах патрабавалі аддачы Гнёта і Сінаўскага суду, а цяпер вельмі здзіўлены, што злачынцаў нават ня зьнялі з працы.

Чаму нічога ня робіць РККПБ і РВК? кажуць сяляне. Гэта запытаем і мы. Шкоднікі павінны быць пакараны.

Красоўскі.

Бюракратызм і галавацяпства.

(Ад нашага карэспандэнта).

Кепска бывае, калі праца праводзіцца наскокам, бяз пляну і ўлічваньня магчымасьцяў. Гутарка ідзе аб галавацяпстве Глускага райвыканкому ў справе самаабкладаньня.

Як можна было дапусьціць такую штуку, што вёска Сіманавічы, прымаючы самаабкладаньне ў суме 407 руб., вынесла пастанову аб дабудовы школы з разьлікам каштарысу ў 2600 руб. А вёска Паршчака. Тут за 806 рублёў самаабкладаньня вынесена пастанова пабудаваць школу ў 4500 руб, Такія «казусы» ёсьць у шэрагу вёсак райёну і характэрней за ўсё зьяўляецца тое, што пас. Чырвоны за 75 руб. самаабкладаньня таксама вынес пастанову пабудаваць школу.

Сялянскія пастановы сьведчаць аб тым, што вёска хоча выбрацца з цемры, але пастановы сьведчаць аб няўменьні працаўнікоў райёну кіраваць справай самаабкладаньня. Сялянскія пастановы засталіся пустым гукам. Сялянскія мары засталіся няздзейсьненымі і наўрад ці здзейсьняцца яны ў хуткім часе.

У справе правядзеньня і выпаўненьня сельска-гаспадарчага падатку Глускі райвыканком можа таксама пахваліцца сваёй халатнасьцю і нядбайнасьцю. Для падмацаваньня гэтага даволі прывесьці факт, што 25 проц. платнікаў адзінага сельска-гаспадарчага падатку зусім яшчэ не плацілі падатку і райвыканком ня дбае аб гэтым. Поўбяды было, калі-б у гэтых 25 проц. няплатнікаў была беднота (беднота-ж вызвалена ад падатку), а то тут ёсьць шэраг асоб, абкладзеных у індывідуальным парадку.

Ня лепш справа з скаргамі па падатку. Цэлая гара іх ляжыць у райвыканкоме, чакае разгляду, але райвыканком ня турбуецца.

Ляжаць два—тры месяцы—палежаць яшчэ столькі.

Тут ужо пахне ня простых галавацяпствам, а скрыўленьнем клясавай лініі (у сэнсе патураньня індывідуальніку) і бюракратызмам (у сэнсе адгляду скарг).

Гэтым шкодным зьявішчам павінен быць пакладзен канец.

А. Дамброўскі.

Фінорганы дапамагаюць кулакам і нэпманам.

(Лупалаўскі райён, Магілеўшчына)

Вельмі шмат пісалася ў нашым друку аб недастатковым наступленьні на капіталістычныя элемэнты ў вёсцы і аб фактах скрыўленьня клясавай лініі ў фінорганах, дапамозе прыватніку. Прывядзём некаторыя факты, якія маюцца ў магілеўскіх умовах, як падатковая інспэкцыя „рашуча змагаецца“ з прыватнікам па спагнаньню нядоімак за некалькі гадоў.

У Машынацкім с.-с. жыве сын былога буйнага абшарніка Казубоўскі, які мае хутар з былога ўласнага маёнтку, таксама надзелен хутарам Бардоўскі Павел, зяць абшарніка Казубоўскага. Гэтыя чужыя людзі самі зямель які не апрацоўваюць, а карыстаюцца наймовай сілай. Казубоўскі і Бардоўскі некалькі год трымалі млын, яны абкладаліся падаткам, не плацілі па некалькі гадоў, у выніку нядоімка 680 руб., 30 р. штрафу і пені і яны ня плацяць да гэтага часу. Пагледзім, ці магчыма з іх спагнаць гэту недаімку? РВК сьцьвярджае, што спагнаць можна, а інспэкцыя не згаджаецца.

Казубоўскі і Бардоўскі маюць на хутарах уласныя будынкі, па 1 карове, па 1 каню і дробную жывёлу. Казубоўскі мае уласны дом у г. Магілеве і добры сад. Дом здаецца пад кватэры, але каб не плаціць нядоімкі, Казумоўскі дом запісаў на сваю жонку.

Другі факт. У Грэбенеўскім с.-с. на хутары Заціпша жыве скрыты скупшчык розных відаў тавару Лесман Абрам Мееровіч. За ім лічыцца нядаімкі 798 р. Гэты спэкулянт па сваёй маемасьці таксама мог бы заплаціць бо мае каня, 2 каровы і зараз займаецца скупкай. Інспэктар зьмілаваўся над «беднасьцю» Лесмана і думаў сьпісаць нядоімку, а РВК запратэставаў і, урэшце, вынесена была пастанова: райфінчастцы нядоімку прыняць без налічэньня пені, растэрмінаваць уплату. Лесман узрадаваўся такой міласьці Акрфа і ўнёс 492 р.

Вось гэтыя два факты яскрава паказываюць, як вядзецца „барацьба“ фінаддзелам з прыватнікамі.

Падарожны.

Правы ўхіл у дзеяньні.

(САМАХВАЛАВІЦКІ РАЙЁН, МЕНСКАЙ АКРУГІ).

Партыя і рабочая кляса пераможна вядуць наступ на рэшткі капіталізму, якія яшчэ ёсьць у нашай краіне. Вядзецца барацьба за сацыялізм, будуецца новае жыцьцё.

Барацьба, якую прыходзіцца весьці партыі, рабочай клясе і бядняцка-серадняцкім пластом сялянства з ворагамі сацыялістычнага будаўніцтва, сустракае ўпартае, шалёнае супраціўленьне апошніх.

Сьвядома ці несьвядома клясаваму ворагу дапамагаюць тыя, якія спалохаліся складанасьці сацыялістычнага будаўніцтва, якія спаўзьлі ўправа ці ўлева з правільнай ленінскай лініі, і аб'ектыўна, а іншы раз і ня толькі аб'ектыўна, знаходзяцца на службе чужых элемэнтаў.

Вось чаму абавязак кожнага камуніста, кожнага пралетара, кожнага працоўнага весьці барацьбу ня толькі з вядомымі контрэвалюцыянэрамі, нэпманамі і кулакамі, але і з правымі і левымі апартуністамі і з прымірэнцамі да іх.

Да чаго-ж прыводзіць правы ўхіл на практыцы, чыім інтарэсам ён служыць?

А вось паслухайце.

КУЛАЦКАЕ ГНЯЗДО.

Яно знаходзіцца ў вёсцы Шабуні, Азярыцкага сельсавету, Самахвалавіцкага райёну. Там сяляне, пад уплывам агітацыі мясцовых кулакоў і ксяндза (апошні жыве ў суседняй вёсцы Каралішчавічы), адмаўляюцца плаціць грошы на самаабкладаньню за 1928-29 г., а таксама дрэнна стала справа і з хлебазагатоўкамі, пакуль ня былі праведзены сходы таварышамі, якія выяжджалі ў Самахвалавіцкі райён па даручэньню Менскага акругкому партыі.

Наколькі моцны ў гэтай вёсцы ўплыў ксяндза, можна судзіць хоць-бы з наступнага. Калі ксёндз прыехаў у вёску Шабуні, дзе ў той час адбываўся сход на пытаньню аб хлебазагатоўках, сяляне, пад кіраўніцтвам кулакоў, зараз-жа пашлі сустракаць і вітаць прыехаўшага да іх ксяндза.

Ня гледзячы на тое, што вёска Шабуні лічыцца вёскай багатай і амаль што кулацкай (некаторыя сяляне маюць там да 30 дзес. зямлі),—усё такі там, зразумела, ёсьць беднота.

Гэта беднота ахвотна пашла-б у бой супроць кулакоў, калі-б ёй дапамаглі арганізавацца, калі-б яе падтрымалі.

Дык чаму-ж гэтай беднатой амаль ніхто ня кіруе, чаму ў гэтай вёсцы не праводзіліся як след сходы на пытаньнях самаабкладаньня і хлебазагатовак, чаму да гэтага часу не знашлі спосабу спыніць контррэвалюцыйную дзейнасьць ксяндза з в. Каралішчавічы?

Хіба гэта ня ёсьць правы ўхіл у дзеяньні, хіба такое прадастаўленьне магчымасьці агітацыі кулаччу і непадтрыманьне беднаты ня ёсьць праява правага апартунізму на практыцы?

МЯККАЦЕЛЫЯ КІРАЎНІКІ.

Кантрольныя лічбы на хлебазагатоўках павінны быць выкананы. Гэта цяпер адна з нашых важнейшых кампаній, ад найлепшага правядзеньня яе залежыць шмат што.

У пытаньні загатовак, як і ўсюды, у нас ідзе бязьлітасная барацьба з кулацтвам, з рэшткамі капіталізму ў нашай краіне.

Праз каапэрацыю і калектывізацыю мы перабудоўваем нашу савецкую вёску на сацыялістычны лад, пры дапамозе каапэрацыі і калектывізацыі мы, бязумоўна, разаб'ем кулацкія сілы.

Для дасягненьня буйных посьпехаў, трэба, каб калектывізацыя праводзілася правільна і энэргічна, каб каапэрацыя ў вёсцы вяла выразна-клясавую работу.

Як-жа пастаўлена ў гэтым кірунку справа ў Самахвалавіцкім райёне (с-с. Узьлянскі, Дудзіцкі, Азярыцкі і Цеплінскі)?

Нажаль, далёка ня так, як належыць.

Каапэрацыя, як спажывецкая, так і сельска-гаспадарчая, кепска падрыхтаваны да правядзеньня хлебазагатоўчай кампаніі, іх апараты недастаткова гібкія, каб адбіваць наступленьне прыватніка, каб самім біць яго.

Складаў для прыёму зярна вельмі мала. Само зярно ляжыць у мяшках, у вёдрах, у старых бочках, і пацукі расьцягваюць яго. Зярно, зразумела, ад гэтага псуецца. А нашы клясавыя ворагі—нэпманы і кулакі—атрымліваюць козыр у рукі, каб ганьбіць каапэрацыю перад бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства.

Бываюць выпадкі і водпуску дэфіцытных тавараў гандлярам, папам, рабінам. Так, напрыклад, гандляр Сьвірноўскі ў мястэчку Узьляны гандлюе півам і трымае заежджы дом, а дачка, якая пры ім жыве, зьяўляецца пайшчыцай мясцовай каапэрацыі і атрымлівае на сябе і на свайго бацьку-гандляра дэфіцытныя тавары.

А член Міханавіцкай спажывецкай каапэрацыі піша ў каапэрацыйную краму запіску, у якой просіць адпусьціць „айцу“ Дзімітрыю (мясцовы поп) цукру.

Ці не занадта мяккацелыя кіраўнікі спажывецкай каапэрацыі Самахвалавіцкага райёну? І ці не называецца гэта скрыўленьнем клясавай лініі?

ВА ЎЛАДЗЕ ПРЫВАТНІКА.

Ня лепш, калі ня горш справа і ў сельска-гаспадарчай каапэрацыі раёну. Там, напрыклад, выдаюць пазыкі клясава варожым нам элемэнтам.

Буйны арандатар Розэнгаўз атрымаў пазыку ў 200 р., былы арандатар абшарніцкіх маёнткаў, а зараз трымае шынок Гантман таксама атрымаў пазыку ў 200 р. Апроч таго, яму выдалі на пакрыцьцё даху шынка 45 пудоў дахавага жалеза.

У той-жа час беднякам і сераднякам, якія сапраўды адчуваюць патрэбу, вельмі часта адмаўляюць у крэдыце.

Характэрная падрабязнасьць: рахункаводам там працуе дачка гандляра і яна ў поўнай ступені ўплывае на водпуск пазык гандлярам, нэпманам і г. д.

А Левін, старшыня крэдытнага таварыства, не паклапаціўся, каб выправіць хібы і каб даставіць своечасова сялянам дастатковую колькасьць неабходных им для асеньняй пасеўнай кампаніі ўгнаеньняў.

Аб чым думаюць палітычныя кіраўнікі Самахвалавіцкага раёну?

ПРЫШЧЭПАЎШЧЫНА Ў ДЗЕЯНЬНІ

Далёка не заўсёды правільна праводзілася ў раёне і земляўпарадкаваньне. Тут у гэтай справе яшчэ вельмі моцна пахне дрэннай памяці прышчэпаўскім душком.

Замест таго, каб арганізаваць з мястачковай беднаты калгасы, зямлю раздробілі на дробныя вучасткі, г. зн. праводзілі ў земляўпарадкаваньні выразна апартуністычную, выразна правую палітыку.

І гэта тым большае злачынства, што як высьветлілі таварышы, якія абсьледавалі раён па даручэньню Менскага акругкому КП(б)Б, цяга беднаты ў калгасы там вялікая, настроі беднаты, ня гледзячы на кулацка-папоўскую агітацыю, зусім спрыяючыя нашай палітыцы ў вёсцы.

Хто-ж пры такім земляўпарадкаваньні атрымаў у Самахвалавіцкім райёне зямлю? Беднякі, ці таксама тыя-ж нашы клясавыя ворагі?

Вось некалькі характэрных прыкладаў гэтага.

Пры земляўпарадкаваньні зямлю атрымалі некаторыя служачыя, якія працуюць у Менску—нейкія Рубін, Соскін і многія іншыя. І вось яны здаюць свае землі ў арэнду буйнаму арэндатару Розэнгаўзэну, таму саману Розэнгаўзэну, які атрымаў 200 руб. пазыкі ад сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

А былы буйны лесапрамысловец Сьвірноўскі здае нейкім спосабам атрыманыя ім 2 дзесяціны ў арэнду на палову мясцовым сялянам, іншымі словамі спэкулюе зямлёй.

Сам-жа ён гандлюе ў мястэчку Узьляны півам, трымае там заежджы двор.

Шынкар і былы арандатар абшарніцкіх земляў Гантман, той самы, які атрымаў з сельска-гаспадарчай каапэрацыі пазыку ў 200 руб. і 45 пудоў дахавага жалеза, таксама атрымлівае зямлю, хоць яму ўжо каля 70 год, хоць ён зусім не бядняк і хоць ён на зямлі сам працаваць ня будзе.

А зяць Гантмана служыць у Мінаўскім каапэратыве на базе і адначасова будуе сабе ў Узьлянах дом.

Так арыгінальна праламляюцца ў жыцьцё дырэктывы партыі і савецкай улады ў Самахвалавіцкім райёне.

МАСАВАЯ РАБОТА ДРЭННА ПАСТАЎЛЕНА.

Зусім дрэнна пастаўлена ў Самахвалавіцкім раёне і масавая агітпрапагандысцкая работа.

Напрыклад, значэньне хлебазагатовак не растлумачвалася сялянам на сходах, ім нават не спрабавалі растлумачыць увесь палітычны сэнс кампаніі, усю неабходнасьць даць хлеб сваёй рабоча-сялянскай дзяржаве.

Прыехаўшым з Менску таварышам прышлося самім зьбіраць сходы беднаты і растлумачваць ёй усю важнасьць хлебазагатоўчай кампаніі.

Беднота аднеслася вельмі добра да дакладаў менскіх таварышоў і ахвотна прыняла ўсе кантрольныя лічбы на хлебазагатоўках. Ужо шэраг вёсак выканалі нават з некаторым перавышэньнем кантрольныя лічбы заданьня.

І так ня толькі ў важнейшым пытаньні аб хлебазагатоўках. Значэньне кантрактацыі таксама не растлумачваецца як сьлед сялянам.

Пару слоў аб прэміраваньні сялян за лепшае выкананьне хлебазагатоўчых заданьняў. Гэта прэміраваньне ў Самахвалавіцкім раёне арганізавана вельмі падзіўнаму. Замест таго, каб прэміраваць сялян патрэбнымі ім у гаспадарцы рэчамі (с.-г. машыны, лемяшы, адвалы і інш.), ім даюць зусім непатрэбныя рэчы.

Слаба працуе і большасьць грамадзкіх арганізацый у вёсцы—крамныя камісіі і інш. Вельмі рэдка бываюць адчыненыя партсходы, сходы беднаты. Надзвычайна мала там партыйцаў і камсамольцаў.

Настаўніцтва прымае ўдзел у грамадзкім жыцьці сельсавету, мястэчка, вёскі. Але гэты ўдзел не заўсёды дастаткова актыўны.

Усё гэта балюча адбіваецца на масавай рабоце сярод беднякоў і сераднякоў вёскі.

А ПРЫВАТНІК ДЗЕЙНІЧАЕ.

У той час, калі нашы хлебазагатоўцы моцна сьпяць, у той час калі хлеб, здадзены сялянамі, гніе ў мяшках і бочках, расьцягваецца мышамі, у гэты час прыватнік ня траціць дарма часу, а дзейнічае.

Праз свякоў і знаёмых кулакоў ён скупляе хлеб у вёсках, ён прывозіць гэты хлеб у Менск на рынак і прадае тут насельніцтву па павышанай цане. Скупляе ён і сала і іншы дэфіцытны тавар, на ўсім налыўваецца, усім спэкулюе.

Вось некалькі з гэтых злосных агітатараў, ворагаў нашай палітыкі ў вёсцы.

Сэкратар мэліарацыйнага таварыства ў вёсцы Шэлягі Азярыцкага сельсавету, Самахвалавіцкага раёну Андрэй Шэляг. Гэты, з д

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Эканамічнае Нарады пры СНК БССР

аб устанаўленьні гранічных расцэнак налеважагатоўкі, вывазку і сплаў драўніны ў сезон 29-30 г.

Адзначаючы нездавальняючае выкананьне пляну дровалесазагатовак бягучага апэрацыйнага году і значнае павышэньне пляну дровазагатовак на 29-30 год у параўнаньні з фактычным выкананьнем за 1928-29 год, Эканамічная Нарада пры СНК БССР пастанаўляе:

1) Прапанаваць усім дровазагатоўчым арганізацыям сваечасова прыступіць да дровазагатовак і асабліва шырока разгарнуць асеньнюю кампанію дровазагатовак —з тым, каб у 1-м квартале было загатоўлена ня менш 45 проц. ад гадавога заданьня (колькасьць гадавога заданьня 3.420.000 кол. куб. мэтраў) згодна пляну дровазагатовак на 1929-30 г., прынятаму нарадай пры Сэкратарыяце Асобнаўпаўнаважанага СПА 29-VIII—29 г.

2) Прапанаваць Наркамзеляробству безадкладна забясьпечыць лесасечным фондам лесазагатоўцаў на ўсе 100 проц.

3) Прапанаваць лесазагатоўчым арганізацыям безадкладна прадставіць у Дзяржбанк заяўкі на патрэбныя ім на дровалесазагатоўкі сродкі і ўстанавіць дэцэнтралізаваны парадак фінансаваньня.

Абавязаць НКФ забясьпечыць НКЗ неабходнымі сродкамі ў 1 квартале на работы на дровалесазагатоўках.

4) Прапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам у самым тэрміновым парадку прыступіць да ўстанаўленьня праз Акргандлю супольна з прадстаўнікамі зацікаўленых устаноў і прафарганізацый лімітных цэн на дровазагатоўкі, вывазку і сплаў па раёнах.

Працу па ўстанаўленьню лімітных цэн правесьці з такім разьлікам, каб імі лесазагатоўцы маглі кіравацца з пачатку апэрацыйнага году.

Устаноўленыя цэны павінны абавязковай ў копіі накіроўваццa Асобнаўпаўнаважанаму Экана па дровалесазагатоўках.

Устаноўленыя цэны зьяўляюцца абавязковымі для ўсіх лесазагатоўцаў данае акругі.

Кантроль і нагляд за няўхільным і бязумоўным выкананьнем устаноўленых лімітных цэн ускладаецца на Асобнаўпаўнаважанага Экана па дровалесазагатоўках, на акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты.

За парушэньне ўстаноўленых лімітных цэн вінаватыя прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

5) У мэтах недапушчэньня няўвязак у нормах і расцэнках паміж сумежнымі з РСФСР і УССР раёнамі, а таксама паміж раёнамі сумежных округ і асабліва ў стыкавых мясцох—прапанаваць акрвыканкомам не пазьней 25 кастрычніка правесьці канчатковае ўзгадненьне нормаў і расцэнак паміж раёнамі, не дапушчаючы ў іх разрываў, якія маглі-б зьявіцца прычынаю пераходу рабочае сілы з раёнаў з больш нізкімі расцэнкамі ў раёны з павышанай аплатай.

6) Даручыць Асобнаўпаўнаважанаму Экана па дровалесазагатоўках распрацаваць у 3-хдзённы тэрмін па ўзгадненьні з зацікаўленымі органамі нормы выпрацоўкі, вывазкі і нормы хлебафуражка на лесазагатоўчыя работы для абавязковага кіраваньня лесазагатоўчымі арганізацыямі.

7) Прапанаваць НК Працы сваечасова забясьпечыць усіх лесазагатоўцаў неабходнай рабсілай.

Што-ж датычыцца забясьпечаньня гужавою сілаю і парадку здавальненьня ёю запатрабаваньня лесазагатоўцаў, то Асобнаўпаўнаважаны Экана супольна з НК Працы павінен даваць указаньні на месцы.

Адначасова ў мэтах выкананьня праграмы па дровалесазагатоўках на 29-30 г. —прапанаваць усім лесазагатоўчым арганізацыям супольна з НК Працы і саюзам сельгаспрацоўкі у 3-хдзённы тэрмін прапрацаваць плян мерапрыемстваў па арганізацыі апарату для правільнага вучоту, вярбоўкі і разьмеркаваньня рабсілы і сваечасовага забясьпечаньня ёю лесазагатоўцаў у патрэбнай ім колькасьці.

8) Прапанаваць лесазагатоўчым арганізацыям прапрацаваць і ўнесьці ў свае прамфінпляны 29-30 г. мерапрыемствы па мэханізацыі і рацыяналізацыі дровалесазагатовак, сплаву і выгрузкі.

Старшыня Эканамічнае Нарады БССР **М. Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнае Нарады **В. Крывіцкі.**

12 кастрычніка 1929 г.
г. Менск.

ТРАМВАЙ ПАЙШОЎ.

... Трамвай пойдзе, трамвай пашоў... вось што можна было пачуць на кожным кроку ў нядзелю, 13 кастрычніка, на вуліцах Менску. На кожным рагу Савецкай вул. можна было бачыць вялікія грамады народу, якія з

нецярплівасьцю чакалі, калі пойдзе трамвай.

Але калі па Савецкай можна было так-сяк так прайсьці, дык на пляцы супроць пасажырскага вакзалу, дзе сталі ўпрыгожаныя зеляніной і чырвонымі сьцяжкамі трамвайныя вагоны, было столькі народу, што ня было дзе яблыку ўпасьці.

Вагоны аглядаюць з усіх бакоў. Мала гэтага: многім хочацца наглядзець сярэдзіну вагону. У вагоны прупца людзі.

— Хто гэта думаў—гаворыць лагодна мой сусед,—каб мы дачакаліся трамваю. Аб гэтым доўга гаварыла калісьці старая гарадзкая дума, але нічога не зрабіла, а зараз—глядзі!...

На пляцу адчыняецца мітынг-пленум Менскага гарсавету. Адчуваецца ўрачыстасьць моманту; бачыш вялікае дасягненьне, вялікую перамогу на гаспадарчым фронце.

Выступаюць з прамовамі т. т. Галадзед, Аксючыц, Кадушын, Клімковіч, прадстаўнікі шырокіх рабочых арганізацый і інш. Усе адзначаюць, што пуск трамваю ў Менску зьяўляецца фактам вялікай важнасьці. Пуск трамваю, адзначыў т. Галадзед у сваім выступленьні, зьяўляецца сымбалем вялізных, шпаркіх тэмпаў індустрыялізацыі краіны, ён сьведчыць аб шпаркіх тэмпах росту сацыялізму ў краіне Саветаў.

Краіна бадзіт, пяскоў і лясоў вырастае ў краіну электрастанцый, трамваяў і буйных прамысловых прадпрыёмстваў.

Сход прыняў наступную рэзалюцыю:

Заслухаўшы даклад аб скончаньні пабудовы 1 і 2 маршр. трамваю, пленум Менскага гарадзкога савету канстатуе, што пуск трамваю зьяўляецца яшчэ адным буйным дасягненьнем працоўных нашага гораду ў галіне камунальнага будаўніцтва і яго дабрабыту.

Зьвязваючы акраіны гораду з цэнтрам, трамвай наблізіць культустановы цэнтру гораду да працоўных, акраін, палепшыць перасоўваньне рабочых гораду на прадпрыёмствы, з'эканоміць дзякуючы таннаму тарыфу, сотні тысяч руб. працоўных.

Таму пуск трамваю мае вялізарнае палітычнае, культурнае і эканамічнае значэньне.

Пленум з асаблівым здавальненьнем адзначае, што 98 проц. усяго абсталяваньня трамваю выканана нашымі савецкімі заводамі, што сьведчыць аб тым, што лінія камуністычнай партыі на высокі тэмп індустрыялізацыі ўжо дае практычныя вынікі.

Вітаючы рабочых гораду з новым дасягненьнем, пленум гарсавету заклікае ўсіх працоўных пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі да напружанай работы па зьнішчэньню часовых цяжкасьцяў.

За рэвалюцыйныя сьвяты!

Антырэлігійная дэманстрацыя дзяцей.

У ціхі асеньні вечар урэзаўся вясёлы гоман дзіцячых сьпеваў.

Вуліцы Менску ажылі.

Ішлі доўгія стройныя шэрагі дзяцей, школьнікаў і піанэраў...

Сотні, тысячы дзіцячых галоў, сьцягі, плякаты, лёзунгі, паходні.

Адзіным парывам гучэлі звонкія галасы:

„Ня трэба нам папоў!
Ня трэба нам равінаў!..“

Шматлікія лёзунгі ў шэрагах заклікалі адкінуць старыя рэлігійныя забабоны, заклікалі будаваць новы калектыўны быт.

Малюнкі, зробленыя дзяцьмі, паказвалі клясава-варожа-шкодніцкую ролю папоў, равінаў, ксяндзоў, сэктантаў, кулакоў і нэпманаў.

— Мы супроць рэлігійных сьвят!

— Прэч равінаў і папоў!

— Ня верым хлусьлівым [illegible] равінаў!

Адначасова дзеці заклікаюць бацькоў працаваць у «судны дзень», замяніць рэлігійныя сьвяты—рэвалюцыйнымі.

* * *

На школьнай вуліцы прытуліліся старыя будынкі сінагог.

„Судны дзень“—Іом Кіпур, а ў сінагогах—пуста. Толькі адзінокія згорбленыя барадатыя наведвальнікі нешта ціха шэпчуць...

Моладзі тут няма. Дзеці—яны на вуліцах дэманструюць супроць старога сьвята, якое адыходзіць у мінулае.

Дарогу маладым будаўнікам сацыялістычнага ладу!

Маз.

Жывыя сьведкі.

НА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ Ў «ДОМЕ СЕЛЯНІНА».

Вялікі пакой 4-га паверху Цэнтральнага Дому Селяніна запоўнен рознымі экспанатамі па сельскай гаспадарцы. Тут паказаны вынікі дасягненьняў па агрыкультуры ў савгасах і калгасах. Гэтыя дасягненьні асабліва вызначаюцца, калі іх параўнаць з экспанатамі індывідуальных гаспадарак.

Вось яблыкі з савгасу „Тарасава“, бульба з савгасу „Чырвоны капэратар“ —кожная важыць каля 300-400 грам.

Камунары сельска-гаспадарчай арцелі „Трудолюбие“ дабіліся таго, што на іх палёх расьце бручка ў 10-12 клгр. кожная. Кожны гэктар дае каля 3000 пудоў капусты.

Вызначаецца сваёй асаблівай якасьцю авёс з камуны імя Ліўкнехта.

Жывыя сьведкі-экспанаты з розных калгасаў і савгасаў Меншчыны гавораць аб буйных дасягненьнях калектыўнай гаспадарцы, паказваюць слабасьць асобных індывідуальных гаспадарак.

На выстаўцы таксама паказаны вынікі працы Навукова-Дасьледчага Інстытуту па агрыкультуры.

Выстаўка дыяграмамі і плякатамі адбівае рост і дабрабыт асобных калгасаў і савгасаў.

Выстаўка будзе адчынена ў працягу 4-5 дзён.

Ж.

„Сав. Беларусь“ расьсьледвала.

ЗЬНЯЛІ З ПРАЦЫ.

У Кузьмінскім сельсавеце, Церахоўскага раёну сэкратаром сельсавету быў Шаўкаўцоў, які нядбайна выконваў свае абавязкі, дрэнна адносіўся да вылучэнкі Громавай і, наогул, да сялян. Гомельскі Акруговы Выканаўчы Камітэт, расьследаваўшы гэту справу, знайшоў, што факты, выкладзеныя ў допісе, поўнасьцю пацьвердзіліся.

На падставе гэтага камісія па чыстцы савецкага апарату зьняла Шаўкоўцава з працы.

АБВЕШЧАНА ВЫМОВА.

У допісе „Бюракратаў на від“ зазначалася, што супрацоўніца Койданаўскай Рабочай амбуляторыі сыстэматычна позьнілася на працу, бюракратычна адносілася да наведвальнікаў і г. д. Пастановай Койданаўскага РВК супрацоўніцы Шульман Б. абвешчана вымова.

СТРАХОЎКА ВЫПЛАЧАНА.

У допісе „Ці ж гэта ня зьдзек“ аўтар паведамляў, што ўдаве Янушэвіч ня хочуць плаціць страхавой узнагароды за карову.

Грэскі РВК растлумачвае, што выплата страхоўкі затрымлівалася з прычыны недастатковай колькасьці прадстаўленых дакумантаў; страхоўка ўжо выплачана.

МАШЫНА АДРАМАНТАВАНА.

Аўтар допісу „Ржавая машына“ пісаў, што ў Менску на панадворку Белсельтрэсту валяецца ржавая малатарня. Белсельтрэст паведамляе, што малатарня з савгасу „Лагоза“, Менскай акр., знаходзілася на панадворку больш трох месяцаў. Ремонт малатарні затрымліваўся з прычыны адсутнасьці некаторых частак.

Зараз машына адрамантавана і адпраўлена ў савгас.

Пастанова калегіі НК РСІ БССР

аб чыстцы бірж працы ад 11-X—1929 г.

Прымаючы пад увагу, што беспрацоўныя, якія састаяць на вучоце Бірж Працы, зараз праходзяць праверку і чыстку, зараз праходзяць праверку і чыстку бірж, згодна з пастановай органаў працы праз асобныя каналі органаў працы праз асобныя каналі і па спэцыяльнай інструкцыі НК Працы СССР, Калегія НК РСІ БССР пастанаўляе:

а) Увесь матар'ял, які быў сабраны раней па лініі РСІ на беспрацоўных, а таксама і пастанавы органаў РСІ па чыстцы Бірж Працы, перадаць зараз існуючым камісіям НК Працы па чыстцы бірж для непасрэднага разгляду і вырашэньня па сутнасьці на агульных падставах, згодна пастановы НК Працы СССР ад 13-VII—1929 г. № 224.

б) Спыніць у органах РСІ разгляд скаргаў, апэляцый і заяў беспрацоўных на рашэньні камісій РСІ па чыстцы бірж, накіроўваючы іх у камісіі НК Працы. Таксама перадаць адпаведным камісіям НК Працы для разгляду па сутнасьці і тыя справы беспрацоўных, якія атрымалі тое ці іншае рашэньне Калегіі РСІ ў парадку разгляду скаргаў на рашэньні камісій РСІ.

в) Цэнтральнай камісіі па чыстцы апарату і акруговым РСІ выканаць гэтую пастанову неадкладна.

ХРОНІКА

МАСАВЫЯ ВЫЕЗДЫ МЕНСКІХ РАБОЧЫХ У ПАДШЭФНЫЯ ВЁСКІ

Брыгада рабочых з заводу „Чырвоная Зорка“ разам з падшэфнымі сялянамі арганізоўвае чырвоны абоз з хлебам.

* * *

10 рабочых п-я друкароў выехалі ў калгас „Агрыкультура“, дзе прымалі ўдзел у правядзеньні сьвята.

* * *

Рабочая брыгада з заводу „Бальшавік“, у колькасьці 50 чалавек, выехала ў падшэфныя вёскі, дзе прымала ўдзел у правядзеньні „Дню ўраджаю і калектывізацыі“.

* * *

Рабочыя сьпіртна-водачнага заводу правялі 2 суботнікі—па 2 гадзіны—на нарысьць пабудовы трактарнай калёны.

* * *

Завком шклянай гуты „Пралетары“ накіраваў на некалькі дзён у вёску групу рабочых. Падшэфным сялянам накіравана е-г. літаратура.

Працуем у дні рэлігійных сьвят.

Экскурсіі школьнікаў.

Учора ў дзень „Іом Кіпур“ ва ўсіх яўрэйскіх школах заняткі праходзілі нармальным тэмпам.

Некаторыя школы наладжвалі экскурсіі ў бліжэйшыя савгасы, фабрыкі і заводы.

Поўны ход.

Учора ў дзень Іом Кіпур яўрэйскія рабочыя амаль на ўсіх прадпрыемствах выйшлі на працу. Яўка—стопроцантная. Фабрыкі і заводы працавалі поўным ходам, бяз усялякіх перабояў.

На пабудовы самалёту „Біробіджан“.

У сувязі з яўрэйскімі сьвятамі на фабрыках і заводах Менску праводзяцца суботнікі на пабудову самалёту „Біробіджан“, а таксама ў фонд узмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Льготы рабочым-студэнтам рабфакаў.

Рабочыя-студэнты рабфакаў і вячэрніх індустрыяльных тэхнікумаў паводле закону павінны працаваць на прадпрыёмстве замест васьмі 6 гадзін з аплатай як за нармальны рабочы дзень.

Усебеларускі зьезд рабочых і сялян латышоў.

Усебеларускі зьезд рабочых і сялян латышоў, які склікаўся на 30 кастрычніка, перанесен на 15 лістапада бягучага году.

Футбольная сустрэча Менск-Смаленск.

У нядзелю 13 кастрычніка на летнім спартыўнай пляцоўцы „Профінтэрн“ адбылася сустрэча паміж футбольнымі камандамі „Дынамо“ Менску і Смаленску.

Гульня выклікала вялікую зацікаўленасьць з боку працоўных Менску. У часе праходжэньня мачту прысутнічала каля 2000 чал.

Вынікі сустрэчы — 4:1 на карысьць Менску.

Менск—Астрашыцкі Гарадок на вела-машынах.

13 кастрычніка, быў праведзен веларэбег па маршруту Менск-Астрашыцкі-Гарадок—Менск. Удзельнічала—22 чал.

Дыстанцыя ў 44 км. пройдзена за 2 гадзін 58 сэк.—т. Максімовым, 35 гадовы ўдзельнік прабегу т. Тарасік таксама добра выканаў.

У Астрашыцкім Гарадку ўдзельнікам прабегу была наладжана ўрачыстая сустрэча.

За нядбайнасьць—да адказнасьці.

На барысаўскім заводзе Лесбелу „Камінтэрн“ некальні месяцаў таму назад з прычыны слабай пастановкі тэхнікі безапаснасьці быў забіты рабочы Статкевіч.

На месца выяжджаў прадстаўнік Менскай інспэкцыі працы, але ніякіх канкрэтных мер ня было прынята для зьнішчэньня заўважаных недахопаў. Пасьля таго, як аб гэтай справе было надрукавана ў газэтах, у Барысаў выяжджала спэцыяльная камісія для дасьледваньня. Дасьледваньне выявіла шэраг недарэчнасьцяў і валакіты ў гэтай справе.

Наркамправы БССР запрапанаваў Лесбелу неадкладна ажыцьцявіць шэраг мерапрыемстваў па ахове працы і тэхніцы безапаснасьці на зав. „Камінтэрн“.

За дапушчаную Менскай інспэкцыяй працы нядбайнасьць да вынікаў абсьледваньня абвешчана вымова акруговаму інспэктару працы т. Сакалінскаму. За непрыняцьце мер спагнаньня да асоб, якія дапусьцілі валакіту ў выкананьні прапаноў абсьледваньня Інспэктару працы Дысінай пастаўлена на від.

Побач з гэтым пастаноўлена зьняць з працы тэхнічнага інспэктара Балесінскага за дапушчаную нядбайнасьць і непрыняцьце рашучых мер па тэхніцы бязапаснасьці. Пастаноўлена таксама згадзіцца са зьняцьцем з работы барысаўскага інспэктара працы Міліюкова.

Адміністрацыя заводу „Камінтэрн“ прыцягваецца да судовай адказнасьці.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 15-е КАСТРЫЧНІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.95,5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	127.50	129.50
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.25	100.65
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.55	25.65
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.01	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.41	10.75
1 выйг. паз. Індустр. 27 г.	25.20	25.30
2 „ „ „ проц.	25.34½	25.42½
2 „ „ „ б-проц.	25.34½	25.44½
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	101.33	101.33
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.40	—

Апавяшчэньні.

Зўатра 15-га кастрычніка г.г. адбудзецца ўрачыстае адчыненьне рабоча-сялянскага унівэрсытэту па радыё. З прывітаньнем выступяць: прадстаўнік ад ЦК заг. АПА т. Сяньковіч, заг. культаддзелу ЦСПСБ т. Клімковіч і прадстаўнік ад студэнтаў.

Праўленьне унівэрсытэту.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня 15-X—г. г. роўна а 7-й гадз. увечары адбудзецца адчыненьне сход ячэйкі КП(б)Б Працасьветы.

На парадку дню—вынікі чысткі ячэйкі. Запрашаюцца асьветнікі г. Менску.

У Калінкавіцкім раёне 26-X-29 г. а 10 гадз. ран. адбудзецца раённая нарада рэдкалегій насьценгазэт і рабселькораў у памяшканьні Нардому.

Парадак дню:

1. Чарговыя задачы рабселькораў.
2. Перавыбары рэдкалегій насьценгазэт.
3. Бягучыя справы.

Адказны рэдактар. П. ШАСТАКОЎ.

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД СЕЛЬСКА.-ГАСП. КААПЭРАЦЫІ.

Рэарганізацыя с.-г. каапэрацыі.

На ранішнім пасяджэньні 12 кастрычніка Наркомземляробства т. Рачыцкі зрабіў даклад аб рэарганізацыі с-г. каапэрацыі.

Тыя задачы, якія стаяць у сучасны момант перад нашай партыяй і савецкай уладай аб перабудове сельскай гаспадаркі, аб пераводзе яе на рэйкі калектывізацыі, вымагаюць рэарганізацыі нашай с.-г. каапэрацыі. Нашу с.-г. каапэрацыю трэба перавесьці на вышэйшую форму працы. Вынікі працы першага году 5-годкі паказалі, што мы з сваімі задачамі спраўляемся ня дрэнна. Тэмп калектывізацыі выконваецца са значным перавышэньнем. Але бяда ў тым, што наша сучасная арганізацыйная структура с.-г. каапэрацыі ня можа забясьпечыць перабудовы сельскай гаспадаркі на новых падставах. С.-г. каапэрацыя, як вытворчая каапэрацыя, павінна забясьпечыць пераход пачатковых вытворчых аб'яднаньняў у вышэйшыя. Наша задача —праз калектывізацыю падняць с.-г. вытворчасьць, зьнішчыць беднасьць і адсталыя формы с.-г. вытворчасьці і павялічыць забясьпечаньне гораду.

Пагэтаму трэба ўтварыць такія арганізацыйныя формы с.-г. каапэрацыі, якія маглі-б ажыцьцёвіць пастаўленыя перад ею задачы. Кірунак гэты—ёсьць кірунак спэцыялізацыі сыстэмы. Да гэтага часу структура с.-г. каапэрацыі была пабудавана на прынцыпах унівэрсалізму. Нашы органы займаліся адначасова перабудовай і развіцьцём сельскай гаспадаркі ва ўсіх яе формах. Гэта часта перашкаджала выконваць канкрэтныя задачы.

Асноўны прынцып новай формы заключаецца ў тым, што раённыя т-ва арганізоўваюцца ў залежнасьці ад с.-г. укладу данага раёну, выходзячы з пераважнай галіны с.-г. вытворчасьці яго. Задача спэцыяльных арганізацый —паглыбляць тую вытворчасьць, якою яны кіруюць, а галоўнае—разгортваць сыстэму аграмаджаньня. Але перад райённымі т-мі пэўнай галіны дзейнасьці таксама ставіцца задача аказваць аградапамогу і іншым галінам с.-г. вытворчасьці.

Гаворачы аб задачах крэдытных т-ваў, дакладчык кажа, што крэдытныя т-вы павінны быць пераведзены выключна на грашовыя апэрацыі. Усе іншыя апэрацыі павінны ад іх адысьці. Задачы крэдытных т-ваў—ацягваць сродкі насельніцтва і кіраваць разьмеркаваньнем крэдытаў.

Кожны селянін павінен быць пайшчыкам толькі ў адным відзе каапэрацыі. У кожным раёне будзе адно раённае т-ва ў залежнасьці ад сельска-гаспадарчага ўхілу гэтага раёну. Межы —адміністрацыйны раён, за выключэньнем мэліярацыйных т-ваў, для якіх мяжа адміністрацыйнага раёну будзе не абавязковай, а будзе ўстанаўляцца ў залежнасьці ад геаграфічных умоў данай мясцовасьці. Асноўная праца т-ваў будзе вытворчая, напрыклад, кантрактацыя, забясьпечаньне с.-г. машынамі, барацьба са шкоднікамі і г. д. У цэнтры будуць існаваць чатыры паасобныя спэцыяльныя Саюзы: Паляводны, Малочна-Жывёлагадоўчы, Калгассаюз і Садова-Гародны Саюз.

У сувязі з рэарганізацыяй с.-г. каапэрацыі трэба будзе зьвярнуць больш увагі на прыцягненьне да працы ў органы с-г каапэрацыі самародкаў, актыўных грамадзкіх працаўнікоў. Таксама прыдзецца больш зьвярнуць увагі на прыцягненьне да працы батракоў. Але адны каапэрацыйныя працаўнікі ня справяцца з гэтай задачай; тут павінны дапамагчы нашы партыйныя і савецкія органы і ўся наша грамадзкасьць.

Спэцыяльныя нашы саюзы павінны будуць працаваць у поўнай прыстасаванасьці адзін да аднаго, папаўняючы ў сваёй працы адзін аднаго, цьвёрда памятаючы, што мэта наша, адна—перабудова сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад. Трэба працаваць так, каб селянін у сапраўднасьці ўбачыў тую перавагу, якую мае сацыялістычны шлях разьвіцьця сельскай гаспадаркі перад капіталістычным.

* * *

На вячэрнім пасяджэньні 12-га кастрычніка выступіў з вялікім дакладам аб задачах с.-г. каапэрацыі старшыня СНК т. Галадзед. Даклад т. Галадзеда будзе вымешчаны ў бліжэйшым нумары нашай газэты.

* * *

13-га кастрычніка зьезд віталі прадстаўнікі чырвонага абозу прыгараднага сельсавету, якія здалі дзяржаве ў гэты дзень да 2000 пуд. збожжа.

Выступаўшыя т. т. Яноўскі і Жыгалка (жанчына) запэўнілі зьезд, што бядняк і серадняк ідуць нага ў нагу з рабочай клясай. Хваля чырвоных абозаў вьяўляецца лепшым доказам таго, што гэта сувязь расьце і мацнее.

ЗАЧЫНЕНЬНЕ ЗЬЕЗДУ.

Зьезд скончыў сваю працу 13-га кастрычніка. Былі прыняты рэзалюцыі па ўсіх дакладах. Па дакладу т. Дубіны зьезд прызнаў дзейнасьць праўленьня Белсельсаюзу ў асноўным правільнай. Зьезд пастанавіў выдаваць часопіс сыстэмы с.-г. каапэрацыі.

Зьезд пастанавіў рэарганізаваць Белсельсаюз у 2 саюзы: Паляводны і Садова-Гародны.

Былі абраны праўленьні, саветы і рэвізійныя камісіі кожнага саюзу.

У праўленьне палявод-саюзу абраны т. т.—Дубіна, Тумаз, Ваціс, Швэдаў і Нядбальскі.

У праўленьне Садова-Народнага саюзу абраны т. т. Пыжыкаў, Панамароў, Каплуноў, Матусэвіч і Сырыцкая.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“.	З панядзелка 14 кастрычніка **„СТАРОЕ І НОВАЕ“.**
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 14 кастрычніка амэрыканскі фільм **„НАНУК“** у 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка САВКІНО № 49. Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	З панядзелка 14 кастрычніка амэрыканскі фільм **„СТАРАЯ № 99“** камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка САВКІНО № 53. Пачатак—а 7 в пал. гадз. Каса а 6 гадз.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“.	З панядзелка 14 кастрычніка **„ЧАНГ“** у 6 частках. Каса адчынена штодня ад 2 гад. Па нядзелям і серадох ад 12 гада.

АБ'ЯВА

Згодна пастановы СНК БССР ад 26-IX-1929 г. арт. I, НКЗ БССР

ДАВОДЗІЦЬ ДА ЎСЕАГУЛЬНАГА ВЕДАМА,

што наступныя сарты культур бранірующца выключна дзеля пасяўных мэт у 1930 г. і скарыстаньне іх на спажывецкія, фуражныя і прамысловыя патрэбы забараняецца.

I—Авёс: Залаты Дождж, Пятнуські, Пабеда, Гігант, Шацілаўскі 56, Лейтавіцкі і Гераленці, Эха, Дыпе, Швецкі.

II—Ячмень: Залаты, Лебядзіная шыя, Прынцэса, Брыо, Вяцкі 1163.

III—Бульба: Вольтман, Сілезія, Сьвіцязь, Эпікур, Раньняя Роза, Кругер.

НК ЗЕМЛЯРОБСТВА.

УСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС

АБВЯШЧАЕ БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК

НА СКЛАДАНЬНЕ ПРАЕКТУ БУДЫНКАЎ АКАДЭМІІ.

ЗА ЛЕПШЫЯ ПРАЕКТЫ БУДУЦЬ ВЫДАНЫ ПРЭМІІ:

I—3.000 р. II—2.000 р. III—1.500 р. IV—1.000 р. V—750 р.

Тэрмін падачы праектаў 15 студзеня 1930 г. Праграму конкурсу можна атрымаць: у Менску—Акадэмія Навук, Ленінская вул., № 29-35.

У Маскве—Маскоўскае Архітэктурнае Т-ва (МАО), Ермалаеўскі зав. 17 і ў Таварыстве Сучаснай Архітэктуры.

МЕНСКІ АКРФІНАДДЗЕЛ НА ПАДСТАВЕ АРТ. 50 ПАЛАЖЭНЬНЯ ПА ПРАМПАДАТКУ

АБВЯШЧАЕ: Усе ўстановы, прадпрыемствы і асобы абавязаны прадстаўляць Акрфінаддзелу весткі аб заключаных з прыватнымі асобамі ўмовах падраду і пастаўкі.

Тэрмін прадстаўленьня—2-хтыдніёвы са дня заключэньня ўмовы.

Дзяржаўныя ўстановы і прадпрыемствы і каапэрацыйныя арганізацыі, здаўшыя падрад ці пастаўку прыватным асобам павінны пры выплаце ім сум трэбаваць ад іх прад'яўленьня належачага рэгістрацыйнага пасьведчаньня Акрфінаддзелу. За непрадстаўленьне ўказаных вестак вінаватыя падлягаюць адказнасьці.

За заг. Менакрфа Рэксьцін. Інспэктар Любіч.

Нар. суд Церахоўскага р-ну, Гомельскае акр. на падставе прысуду за 21 верасьня 1929 г. і 213 ч. I арт. Кр. Кодэксу за нядбайныя адносіны к службовым абавязкам абвяшчае грамадзянскае ганьбаваньне гр-ну Марчанку Міхаюю Сільвестраву, які зьяўляецца старшыню Агародня-Гомельскага сельсавету, Церахоўскага р-ну Гомельск. акр.

Гр. ЭЙСАК Станіслаў Міхайлаў, які паходзіць з грамадзян в. Грабово, Бабруйскага раёну зьмяняе сваё прозьвішча ЭЙСАК на прозьвішча ІСАКОВІЧ. Асоб, якія маюць пратэсты оупроць зьмены прозьвішча просьба паведаміць аб гэтым Бабруйскі Акруговы ЗАГС, паказаўшы сваё імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жыхарства.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Асабовая кніжка запаснога за № 1891 Янусіка Я., выд. Каралінскім РВК, кв. 694п.

— Вучотна-конская кніжка № 495 Назарэнка К., выд. Каралінскім РВК, кв. 695п.

— Пашпарт, выд. бабруйск. міліц., у 1928 г., 2) пасьведчаньне бабруйскага камгасу аб рэгістрац. дома па вул. Карла Маркса № 1, 3) дазвол галоўн. тамож. кіраўніцтва на ўвоз з заграніцы дамовых рэчаў, 4) квіт маскоўск. аддз. Дзяржгандальфлота на пакінутыя ў іх на хаваньне тры месца на імя Кацнельсона М. Ш., кв. 696п.

— Вучотна-зайсковая кніжка № 17 Шчэрбіна Ц. М., выд. Юраўіцкім ВВК, кв. 697п.

— Вучотна-конская кніжка Корана М. З., кв. 698п.

— Пашпарт Фрыдман П. М., выд. гомельск. гарсаветам, кв. 702-п.

— Сяброўская кніжка № 82945 Шэфтэль Д., выд. Мьсціслаўск. саюзам прац. зямлі і лесу, кв. 699п.

— Штамп барысаўск. крэдытна-прамыслов. і каапэрац. т-ва „Труд“, кв. 700п.

— Вучотная картка на каня Хамца Е. П. жых. у в. Кавалі Каралінск. р-ну Маз. акр., кв. 701п.

— Сяброўскі білет № 388 Яніцкага М. Е. саюзам дрэвапрац., выд. завкомам лесазавода ім. Томскага, кв. 702п.

— Вучотна-конская картка № 3320, выд. Веткаўскім сельсав. на імя Гурмого Т., кв. 702п.

— Дапрызыўная кніжка парадж. 1907 Бурава Н. П., выд. Рэчыцкім РВК, кв. 702-п.

— Вучотна-конская карт. Сумак С. Н., выд. Рэчыцк. РВК, кв. 702п.

— Пасьведчаньне Шафран Б., выд. Чэрвабыльскай міліц., кв. 702п.

— Сяброўскі білет с-зу гарнякоў № 1989, выд. шахтком Любімаўскага Дон. акр. на імя Саваськіна Н. В., кв. 702п.

— Хлебная кніжка № 5064 Северынец І. Ф., выд. Рэчыцкім ЦРК, 2) разьліковая кніжка, выд. I-м тэхн. вучасткам водпікаў Днепр. бас., кв. 702п.

— Сяброўск білет № 253776 Абраменка Д. саюза хімікаў, выд. фабком. фабр. „Днепр“, кв. 702п.

— Прамыслова заборная кніжка Кагановіча Л., выд. Рэчыцк. т-вам саматужнікаў, кв. 702п.

— Мэтрычн. выпіс за № 454 Волікава В. Ф., выд. Рэчыцкім загсам, кв. 702п.

— Спраўка аб сацыяльным становішчы Рубіштэйна Б. Б., выд. Калінкавіцкім гарсаветам, кв. 949.

— Асабовае пасьведчаньне з фатагр. карткай Арцюшэўскага С. А., выд. Менскім Акрза, кв. 950.

— Асабовая кніжка Арцюшэўскага С. А., выд. Узьдзенскім РВК, кв. 951.

— Сяброўская кніжка сэкцыі лясных спэцыялістаў Арцюшэўскага С. А., выд. ЦП саюзу сельгаслесрабочых, кв. 952.

— Сяброўскі білет Гарошка Т. А., выд. саюзам прац. зямлі і лесу, кв. 953.

— Заліковая кніжка № 139 Розінай Т. Ш., выд. БДУ, кв. 954.

— Пашпарт Манюкевіч А. С., выд. Менакрміліц., кв. 955.

— Вучотна-конская карт. Папко Е. А., выд. Заслаўскім РВК, кв. 956.

— Комсамольскі білет № 9221 Кохава А., выд. Віцебскім акругкомам, кв. 957.

— Пашпарт Вайнштэйна І., выд. 1-м аддз. міліц. г. Менску, кв. 946.

— Пашпарт Вайнштэйн Н., выд. I аддз. міліц. гор. Менску, кв. 947.

— Атэстат аб скончаньні сямігодкі выд. Калінкавіцк. яўрэйскай сямігодкай і характарыстыка, кв. 948.

— Пашпарт Канадашэвіч А. Ф., выд. Менакрміліц. кв. 944.

— Сяброўскі білет № 453 Крывацубскага Ф. А., выд. Мазырск. акр. аддз. саюза Мэдсанпрацы, кв. 945.

— Каапэрац. кніжка № 1331 Конана Я. С., выд. Барысаўск. прыгароднк. снаж. т-вам, кв. 742п.

100 КАРТИН

Подпишитесь на „Художественные сокровища СССР“, состоящие из 100